Пятро Сіняўскі

# ЗАЧАРАВАНАЯ ГАСПАДАРКА





Пятро Сіняўскі

# ЗАЧАРАВАНАЯ ГАСПАДАРКА

## Казкі гаспадара Пятра з-пад Полацка

Мінск
«Мастацкая літаратура»
2022

УДК 821.161.3-93
ББК 84(4Беи)-44
С38

Мастак *Марыя Каратаева*

*Для дзяцей малодшага*
*і сярэдняга школьнага ўзросту*

Выпуск выдання ажыццёўлены па заказе
і пры фінансавай падтрымцы
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

ISBN 978-985-02-2111-7

© Каратаева М. М., ілюстрацыі, 2022
© Афармленне. УП «Мастацкая літаратура»,
2022



# Янкава крынічка

Жыў-быў на свеце хлопчык Янка. Маленькі такі, ласкавы — раніцой прачнецца, матулю пацалуе, да бацькі прыхінецца ды на вуліцу, на сонейка бяжыць.

Выбежыць, ад яркага святла прыжмурыцца, навокал гляне — хараство якое! Проста перад хацінаю луг, яшчэ росны. Янка на лузе ўсіх чмялёў разбудзіць, са стракозамі навыперадкі паскача, з травы ды з кветак кропелькі расы пазбірае.

А за лугам лес быў, стары, дрымучы. Быццам з выгляду суровы, але ж якая суровасць, калі Янка па сцяжынцы бяжыць, галінкі перад ім расхінаюцца, і тады па сцяжынцы зайчыкі сонечныя скачуць. Птушкі навокал з такой ахвотаю заліваюцца, нібы толькі ўчора спяваць навучыліся. А зязюля бесперапынна Янку гады налічвае: жыві, хлапчына, калі такі ўдалы, доўга ды не маркотна, бацькам на радасць, суседзям на забаву.

Прыбяжыць Янка да возера. Над ім яшчэ туман з ночы расступіцца не паспеў — разыходзіцца, растае, проста на вачах недзе прападае. А вада ў возеры сцішылася, быццам прыслухоўваецца, у якім канцы акунь плюхне і дзе шчупак перавернецца.



Выкупаецца Янка ў возеры, на бераг вылезе, а сонейка яго так і грэе, так і песціць, стараецца ўсё цяпло сваё і пяшчоту перадаць. Вось гэтак і рос Янка, у шчасці ды радасці.

Аднойчы заснуў ён ля возера. Прачнуўся ад таго, што ў горле перасохла, піць захацелася. Устаў з цёплай зямлі і да возера хацеў ісці. А тут зямля пад ім здрыганулася, расступілася — і пад нагамі ў Янкі крынічка засвяцілася. Вада ў ёй як жывая забілася, празрыстая, пад сонейкам іскрыстая.

Прыпаў Янка да крынічкі, напіўся. З тае пары неяк змяніўся — вырас цуда-хлапец.

І вось што за ім сталі прыкмячаць людзі. Калі бяда ў каго здарыцца, Янку цягне, нібы магнітам, да таго чалавека. Прыйдзе, пасядзіць, часам скажа што, а часам і памаўчыць, але паўбяды людской, адыходзячы, з сабой забірае. А з паўбядой чалавек ужо і адзін справіцца.

Калі ж дзе вяселле, Янка там першы. У скоках спрытны, на прыпеўкі гаваркі, на жарты вясёлы. Агонь, а не хлопец!

Гармонік возьме — песня сама сабою ў Янкавай душы складаецца, тут жа і спяваецца. Хіба такая песня не зачаруе? У гэткія хвіліны, калі дзе і была хмурынка ў небе, тут жа растане. Глядзіш, а на яе месцы ўжо месяц зіхаціць, песню ўважліва слухае ды сваёй справай займаецца: дзе цёмна — падсвеціць, дзе трэба — падзалоціць. І тады вёсачка не вёсачка зробіцца, а нібы тое царства трыдзявятае: дрэвы наўкола пад золатам стаяць, возера срэбрам пераліваецца, а ў небе зорачкі, як дыяменты, рассыпаны. Хораша людзям у такія часіны! Так хораша, што забываліся пра ўсё на свеце. Вось які яшчэ дар Янка меў — людзям чароўнае ды прыгожае паказваць.

Але гэта не ўсё. Гулі сабе гулямі, а каб гулі пчолы ў вуллі — працаваць трэба! Янка ў згодзе жыў з працаю. Ён да яе падступіцца — яна

да яго прыхінецца, і атрымліваецца, што не адзін ён працуе, а ўдваіх. Ён і яго праца.

Возьмецца Янка за касу, а касавільна само пад пальцамі да далоні мякка прыстане. Не было касца, роўнага Янку, ва ўсёй ваколіцы.

У лес па дровы паедзе Янка, на дрэва зірне і ўжо бачыць, з якога боку да яго падступіцца. Узмахне сякераю — адразу ж любое ссячэ. Дзівяцца людзі — толькі ў лес ён ехаў, а ўжо назад вяртаецца з поўным возам дроў.

Араць пачне — плуг сам у зямлю лезе ды арэ як трэба.

А ці мала ў вёсцы працы?! І кожную Янка рабіў лепш за ўсіх. За гэта вяскоўцы і паважалі яго. Ды як не паважаць, калі чалавек працуе з душой?

Так і жылі людзі: калі бяда, разам гаравалі, калі радасць — радаваліся разам. А з імі і Янка. Але пражыць жыццё — не поле перайсці. Раз надумаліся два Янкавы сябры з вёскі падацца: пахадзіць, паглядзець, на свет падзівіцца. Сталі Янку падгаворваць. Ён спачатку аднекваўся, а тыя смяюцца:

— Дзіўны ты, Янка. Пойдзем паглядзім, калі што не па нас — назад вернемся. Ды хто ж у маладыя гады дома сядзіць? Трэба ісці шчасця шукаць...

Так і ўгаварылі.

Праводзіны справілі. Колькі дзён вёска то сумавала, то весялілася ад Янкавых развітальных песень. Усё адкладваў, зацягваў дзень адыходу. Не-не ды і засумуе Янка. Не па душы яму гэта. Але куды сябры, туды і ён.

Нарэшце прыйшоў час і сябры пайшлі.

Як праз луг праходзілі — сухі ён, трава пажоўклая, зямля скрозь яе прасвечваецца, кветкі галоўкі апусцілі, пялёсткі закрылі, бы перад заць-меннем. Чмялі, пчолы не гудуць, мёду не збіраюць. Маркотна на сэрцы ў Янкі. А сябрукі яго радасныя ды вясёлыя. Як жа сумным у дарогу



вялікую выпраўляцца? Паглядзіць на іх Янка дый сам засмяецца, падбадзёрыцца.

Праз лес ішлі — дрэвы панурыя ды суровыя стаялі, птушкі не спявалі, голле над сцяжынкаю навісла, неба затуліла.

Цяжка на сэрцы ў Янкі — але ж не адзін ён, з сябрамі.

Ля возера праходзілі — усхвалявалася яно да пенных хваль, суровае зрабілася. Хлопцы хацелі пакупацца ў дарогу, ды расхацелася. А тут смага нястрымная Янку агарнула, і сябры хочуць напіцца. Вось і кажа ім Янка:

— Ёсць тут крыніца з чыстаю вадзіцай. Нап'ёмся і з сабой біклагу нальём.

Падышлі да крыніцы, глянулі — вада ў ёй брудная! Сціснулася ў Янкі сэрца, і піць расхацелася. Сонца ў вялікую цяжкую хмару схавалася, адразу холадам пацягнула.

Далёка ці блізка, доўга ці коратка ішлі сябры і трапілі ў вялікі горад. Вуліцы шырокія, усюды чысціня, парадак. Дрэвы і тыя падстрыжаныя — раўнюткія стаяць. А людзей колькі! Усе прыбраныя, як на свяце.

— Бачыш,— пытаюць хлопцы Янку,— а ты ісці не хацеў, упіраўся. Тут і жыць застанёмся...

А жыць — гэта значыць працаваць. Трэба ўладкоўвацца некуды. Янкавы сябры хутка знайшлі працу па гусце, а Янка ніяк не можа. Да адной прыгледзіцца, да другой — не тое. Нарэшце быццам нешта знайшоў. Ды так толькі падалося. Не ладзіцца ў Янкі праца: ніяк пад руку не патрапіць — ён у адзін бок цягне, яна — у другі. Разлад, хоць плач.

Пайшоў неяк Янка да сяброў у госці думкамі падзяліцца, душою раскрыцца, песні, як даўней, паспяваць, сэрца супакоіць. Дзе там! Калі ён паклікаў іх у вёску, яны толькі плячамі пацiскаюць, дзівяцца:





— І чаго табе не хапае тут?

Паспрабаваў ён песню заспяваць — адразу ж змоўк. Не атрымліваецца нічога. Так і не зразумелі ў той вечар сябры Янку, а Янка сяброў. І вырашыў ён не хадзіць больш да іх — ці мала ў горадзе люду?! Спрабуе новых сяброў адшукаць, цягнецца сэрцам да людзей, як, бывала, у сяле родным: у каго бяда — ідзе дапамагчы, на сябе паўбяды ўзяць. Толькі ўсё наадварот атрымліваецца. Прыйдзе да гаротнага, той убачыць Янку, і робіцца яшчэ горш на душы.

Марнець пачаў Янка — ні жывы ні мёртвы, цень, а не чалавек. І невядома, што сталася б з ім, калі б неяк уначы ці то сон прысніўся, ці то наяве здарылася. Янка і цяпер не ведае.

А здарылася вось што. Толькі заснуў, вярнуўшыся з працы, як сніцца хлопцу, быццам зайшоў ён у лес і заблудзіўся. Кідаецца ад дрэва да дрэва, праз гушчар у хмызняк — нідзе канца-краю няма. Тут яго апанаваў страх, чаго ніколі раней не было. Стаміўся, ногі самі падкасіліся, і ўпаў ён у застаялую ваду. І мроіцца яму, што сядзіць на балотнай купіне, а балота і купіну, і Янку зацягвае. Закрычаў хлапчына, рукамі замахаў, каб за што ўчапіцца. А за што? Хіба толькі за паветра? Ды ўсё ж адчуў ён: нешта пад руку трапілася. Вочы расплюшчыў, а перад ім сядзіць дзед стары ды зусім сівы. І Янка — у сухім ды на цвёрдым.

Дзед на Янку пазірае спачувальна сваімі блакітнымі пранклівымі вачыма. І здаецца Янку: дзед наскрозь яго прасвечвае. Так яно і было, бо гэты дзед не просты, а чараўнік. Ну, можа, не зусім чараўнік, але мудры чалавек. Пытае ён у Янкі:

— Што, хлопец, заблудзіўся?

— Заблудзіўся,— адказаў Янка. Убачыўшы, што дзед гэты неблагі чалавек, крыху супакоіўся. А дзед зноў пытае:

— Калі я цябе на дарогу выведу, куды пойдзеш?

— Не ведаю,— адказвае Янка.



Стары ўважліва паглядзеў на Янку і кажа:

— Кепскія твае справы, хлапчына.

— Чаму?! — здзівіўся Янка.

— Няўжо не ведаеш? Душу ты сваю загубіў.

— Як гэта загубіў?! — здзіўляецца Янка.— Калі я жывы, то і душа пры мне.

— Э, хлапчына, і як жа ты заблытаўся, калі не адчуваеш, што без душы жывеш! На радзіме яна засталася. А была тваёй душой крыніца, чыстая вадзіца.

— Што ж рабіць, дзядуля? — у роспачы пытае Янка.— Пакажы дарогу, я пабягу дадому.

Чараўнік паківаў галавою:

— Бегчы пабяжыш, але пакуль ты блукаў па свеце, твая крынічка-душа заплыла брудам ды смеццем. Вада ў ёй стала, як у балоце, таму і людзі цябе цураюцца. Не будзе табе спакою і дома.

«Што рабіць,— думае Янка,— куды дарогу ў дзеда пытаць?» Ды ўспомніў ён пра сяброў сваіх, што ў горадзе жывуць, і пытае чараўніка:

— А як жа сябры мае, яны ж таксама пайшлі ад роднай хаты? І жывуць, нічога з імі не здарылася.

— Я ж казаў табе, Янка, што душа твая — рэдкасць для чалавека. У хлопцаў душа на месцы — яны забралі яе з сабой, таму і жывуць спакойна.

Не разумее Янка, пытае:

— А чаму ж вада ў маёй крынічцы не муцілася, калі я дома быў?

— Шмат ведаць хочаш! — кажа Янку чараўнік.— Каб расказаць табе пра гэта, трэба казку ў казцы ладзіць. Але так і быць. Слухай. Ад працы ўсё ішло. Пойдзеш касіць — раса, што апала з травы, у зямлю ўсмокчацца, у крынічцы знойдзецца. У лес пойдзеш, галінку зачэпіш ці дрэва трасянеш, усе дажджынкі на зямлю скоцяцца, у яе прасочацца



ды ў тваю крынічку збяруцца. Дзе жменька зярнят, табою сеяных, прарасце, вада, што з іх сцяблінак упадзе, уся ў крынічцы з'явіцца. Вось і атрымліваецца: чым больш ты ля зямліцы-матухны завіхаўся, тым чысцей ды званчэй крынічка твая была.

— Ды я ачышчу яе! — усклікнуў Янка.

— Э, хлопча, усё не так проста. Зробленае назад не адробіш. Перарабіць лягчэй. Але дам табе параду — прасіся ў поля, на паклон ідзі да лесу, перад возерам шапку здымі. Можа, яны чым і дапамогуць.

Сказаў так чараўнік і знік. Ці то спаў Янка, ці наяве ўсё за ноч здарылася, ды як толькі з пасцелі ўсхапіўся, з горада ў сваю вёску заспяшаўся. Прыйшоў дахаты — адразу словы чараўніка ўспомніў. Як той казаў, так і было: маці з бацькам быццам не родныя сталі, у вяскоўцаў радасць якая, прыйдзе да іх Янка — смутак наступае. У каго гора — яшчэ горш, калі Янка пакажацца. Не патрапіць яму з людзьмі ў думках і клопатах. І пайшоў ён у роспачы ў поле.

— Поле, поле! Ты ж маё дзяцінства, дапамажы мне.

Маўчыць поле, не зварухнецца.

Зайшоў Янка ў лес:

— Лес, лес, ты ж маё дзяцінства, дапамажы мне!

Пануры стаіць лес, нават рэха не адгукнулася.

Павярнуўся Янка да вады:

— Возера, возера, дапамажы мне, ты ж маё дзяцінства!

Маўчыць блакітнае возера.

Захацелася Янку піць, успомніў крынічку, глянуў — сэрца як у абцугі заціснула. Заплыла крынічка багнаю, зверху жоўтыя плямы плывуць. Паспрабаваў руку ў ваду апусціць — ды зваліўся Янка ў роспачы і заснуў. А раніцою чуе, нехта будзіць яго. Расплюшчыў вочы, бачыць — сама Праца вясковая перад ім стаіць. Такая нязветлівая, у вочы не глядзіць, але кажа:

— Падымайся, калі жаданне ёсць душу сваю ачысціць. Не хацела я да цябе падыходзіць, але ўпрасіў ты лес, поле ды возера — паслалі яны да цябе. Так і быць, дам табе работу. Упарты будзеш, можа, што і атрымаецца. Але я не веру, бо каля цябе ўжо сама Лянота шастае. Ды і без душы як працаваць будзеш? Адно скажу, калі хочаш, каб добра было, без падману працуй,— прамовіла Праца і знікла. Не магла яна падыходзіць да чалавека, да якога Лянота падступае.

І ўзяўся Янка за працу. Пайшоў у лес дровы сячы. Да дрэва падысці не можа: то яму галіна вочы засланяе, то вопраткай за сук зачэпіцца. А дабярэцца, секане па дрэве — быццам не вастрыём, а абухом — сякера адскоквае. Сякерышча ў руках круціцца, крывавыя мазалі наганяе. А побач Лянота стаіць ды ўгаворвае:

— Адпачні, Янка. Дзень вялікі...

Янка ж адной рукой Ляноту адгоніць, другой пот змахне — і давай сякерай махаць. Ссячэ дрэва, а яно ў самы гушчар зваліцца: не падысці, хоць тут і кідай.

Касіць Янка возьмецца, мужыкі далёка наперадзе пракосам ідуць, а Янка ззаду пляцецца, каса ў яго то ў зямлі напалову загразне, то зверху над травою свісне, то ў камень з усяго размаху ўрэжацца.

Араць выйдзе, плуг то вынырне, па зямлі праскочыць, то ўглыб залезе, ажно конь надрываецца...

Колькі дзён-месяцаў так працаваў Янка, сам не ведаў. Адно стараўся без падману працаваць. Упарты быў хлопец. Рукі ад мазалёў усе ў крыві, спіна не разгінаецца.

Аднойчы працаваў ён ля возера. Не паддавалася яму каса. А тут яшчэ і сонца пячэ, нібы здзекуецца. Як у чыгуне варыўся. І захацелася яму піць. Падаўся да возера, па дарозе на крынічку сваю наткнуўся. Глянуў — вачам не верыць: вада ў ёй чыстая, толькі не такая хуткая. Але пад сонцам зіхаціць, пераліваецца.

Прыпаў Янка да крынічкі сваёй, напіўся, твар абмыў — і пачуў ён, як камень у яго з сэрца зваліўся. Тут і спякота спала.

Доўга сядзеў Янка над чыстай крынічкай. Было яму пра што падумаць.

## Пра вучонага сына і мудрага бацьку

Як спрадвеку вядома, жылі-былі на белым свеце стары са старою, а з імі сын іх Іванка. І жылі не ў трыдзявятым царстве, а дома, або, як той казаў,— тут, дзе ядуць клёцкі з душамі і пахлёбку з круп, дзе ўлетку на градках не пуста, а зімою на стале са свежанінай капуста. Дзе мужык — працаўнік, ды не толькі, бо мудрэйшы ён за грамацеяў там колькі...

Старая катлы з печы на прыпечак і з прыпечка ў печ перасоўвала, ежу гатавала, скацінку даглядала. А сам гаспадар то з касою, то з плугам, бывала, талакою, а часцей саматугам над зямлёй-карміцелькай завіхаўся. Іванка ж над кніжкамі сядзеў крукам — ішла рукою яму навука.

Так і жылі.

І вось аднойчы, калі было ўжо Іванку гадоў раз шэсць па тройчы, да старога са старою чуткі дайшлі: сын іх разумны, ды такі, што і свет яшчэ не чуў.

Вырашыў стары праверыць — суседзі праўду кажуць альбо хлусню як падвалоку вяжуць. Вывеў ён Іванку ў двор, абвёў вакол сваёй старэнькай хаткі, расказаў, як будаваў яе з маці і бацькам. А як праходзілі паўз бярвенне, што ля сянец ляжала, стары спатыкнуўся, ледзь

не паваліўся. Ды Іванка-ўдалец падхапіў бацьку, не даў упасці.

Прыйшлі яны ў поле. Стары паказвае рукою на вялікі камень, які ляжаў там, і пытае:

— Скажы ты мне, Іванка, што гэта такое?

Іванка пачаў словамі сыпаць, як гарох з мяшка,— і як поўнач па камені знайсці, і як поўдзень, і што трэба аб'язджаць яго, калі арэш, бо сапсуеш плуг...

Гадзіну ён пра той камень гаварыў, а калі скончыў, бацька пытае:

— І ўсё?

Іванка здзіўлена на бацьку глянуў, адказаў упэўнена:

— Вядома, усё!

— Дурань ты яшчэ, сынок. Ідзі да людзей розуму набірайся.

Пацiснуў Іванка плячыма, але бацьку паслухаўся.

Год не было яго дома. У свеце вучонаму ды разумнаму справа вядомая: што пісаць, што чытаць, дзе слова ўставіць мудронае, дзе пяром парыпіць, а з гэтага меў ён і есці, і піць.

А як год мінуў, вярнуўся дахаты.



Ізноў павёў яго бацька вакол старэнькай хаткі. Як праходзілі каля бярвення, спатыкнуўся стары, ледзь не паваліўся. Ды Іванка — дзяцюк хваткі, не даў яму ўпасці.

Прыйшлі ў поле. Стары паказвае на камень, пытае:

— Што гэта?

Іванка зноў пачаў словамі сыпаць, як гарох з засека: і адкуль камяні бяруцца, і як утвараюцца, і нават сказаў, як яны па-латыні называюцца... Гадзіны дзве ён пра той камень гаварыў. А калі скончыў, бацька пытае:

— І ўсё?

— Здаецца, усё,— няўпэўнена адказаў Іванка.

Стары нахмурыў бровы і кажа:

— У цябе не толькі розуму няма, але і старэйшых слухаць не ўмееш. Я табе казаў да людзей ісці розуму пытаць, а ты ізноў да папер звярнуўся.

Год быў у людзях Іванка. Разам з імі працаваў, разам песні спяваў, калі свята выпадала (бо, як вядома, каб не збіцца з хлеба, і адпачыць трэба).

А калі год мінуў, вярнуўся дахаты. І не паспеў пыл дарожны з рук змыць, як узяў рыдлёўку і ў поле пайшоў, да каменя вялікага. Стаў яго з зямлі выкопваць. А бацькам сказаў:

— Будзем хату новую будаваць. Гэта ж зусім ужо ў зямлю ўехала. З тых бярвенняў, аб якія ты, тата, увесь час спатыкаешся, зруб зрубім, а гэты камень пад фундамент пойдзе. Заадно і поле ад цяжару вызвалім.

І казаў цяпер Іванка пра камень так коратка, што і певень за гэты час сваё «ку-ка-рэ-ку» праспяваць не паспеў. Сказаў і за працу ўзяўся.

Стары толькі ў вусы ўсміхнуўся і падумаў: «Цяпер і я згодны, што крыху таго розуму, з якім не паперы гартаць, а ў жыцці для людзей неабходным стаць, і ў майго Іванкі ёсць».

# Як Гаўрылка пана са свету зжыў

Жыў-быў Гаўрылка. Конь у Гаўрылкі — галава ды хвост, а паміж іх — рэбры, скурай абцягнутыя. Былі да каня і драбіны — колы драўляныя, спіцы саламяныя, шворан жалезны, а самі з паперы склееныя.

Запрог Гаўрылка каня ў драбіны, паехаў у поле, наклаў дзесяць мяхоў бульбы. Дзесяць бульбінак у кішэнь паклаў і дахаты рушыў. Конь нагамі пераступае, у хамут налягае — колы драўляныя, спіцы саламяныя круцяцца. І едуць папяровыя драбіны, мяхі з бульбаю вязуць. А Гаўрылка збоку ідзе, мяхі падпраўляе, воз падпіхае, каню памагае, каб колы ў канёвым жа следзе не загразлі. І яшчэ глядзіць Гаўрылка, каб гужы не парваліся. Бо парвуцца гужы — трэсне дуга. Трэсне дуга — конь напужаецца, страпянецца, не ў той бок крутанецца — і хрусне аглобля. Хрусне аглобля — пераломіцца шворан. Пераломіцца шворан — драбіны аб дарогу ўдарацца, рассыплюцца. І не давязе тады Гаўрылка бульбу дахаты.

Вязе ды вязе Гаўрылка бульбу і думае: «Прывязу бульбачку, жонка набярэ ў кош, памые, насыпле ў чыгунок, вадой налье, на агонь паставіць. Зварыцца бульбачка — дзеткі пад'ядуць». Думае так і думае Гаўрылка, а тут адкуль ні вазьміся — пан са служкамі на конях наляцеў. Коні ў пана — віхор, служкі дужыя, сам пан здаравенны ды вясёлы. Пытае ён у Гаўрылкі:

— Чаму пехатой ідзеш, чалавеча, ды не на возе едзеш? — А сам адным вокам, хітрым, круціць, другім, прагным, на мяхі з бульбай пазірае.

— Воз падпіхаю, каню памагаю і гляджу, каб гужы не парваліся, бяда не падкралася,— адказвае Гаўрылка.

Усміхнуўся пан у вус ды служкам:

— А праўду Гаўрылка кажа — цяжка яму. Дапамажыце ж чалавеку!

Наляцелі служкі, перакінулі мяхі з бульбачкай у панскі воз, свіснулі, гікнулі, зарагаталі і да панскага палаца памчалі.

Глянуў ім Гаўрылка ўслед і ні з чым дахаты паехаў. Прыехаў, дастаў з кішэні дзесяць бульбінак. Жонка іх памыла, кінула ў чыгунок, наліла вадой, на агонь паставіла. А калі зварыліся, раздала дзеткам. Кожнаму па бульбінцы. А Гаўрылка з жонкаю не паеўшы спаць леглі.

Назаўтра чуць свет сабраўся Гаўрылка і паехаў у поле. Накапаў дзесяць мяхоў бульбы, дзесяць бульбінак у кішэнь паклаў і едзе дахаты другой дарогай, каб пана са служкамі не сустрэць.

А яны тут як тут.

Ускочыў Гаўрылка на воз — конь стаў.

Падляцелі пан са служкамі да Гаўрылкі. Пан адным вокам, хітрым, круціць, другім, прагным, на мяхі з бульбай пазірае. Пытае ў Гаўрылкі:

— Чаго на возе сядзіш, чалавеча?

— Дамоў еду,— адказвае Гаўрылка.

Пан да служак сваіх звяртаецца:

— А і праўду Гаўрылка кажа — цяжка яму. Ну, што стаіце, дапамажыце каню.

Наляцелі служкі на Гаўрылкаў воз, мяхі з бульбаю на панскі перакінулі, з кішэні ў Гаўрылкі дзесяць бульбінак вытраслі. А потым — толькі і бачыў іх Гаўрылка.

Прыехаў Гаўрылка ў свой двор, каня адпрог, пасвіцца пусціў, а сам у хатку не ідзе — цяжка будзе дзеткам у вочы паглядзець. Яны ж так есці хочуць!

Сеў Гаўрылка на драбіны і думае, што рабіць яму: ці ў сцяну лбом ударыцца, ці ў вір галавой кінуцца? Ды не мог ён у вір галавой. «Каб сам, дык што? А без мяне дзеткі, птушаняткі неапёраныя, прападуць».

І ўсё ж надумаўся Гаўрылка, што рабіць яму.





Дачакаўся раніцы і да панскага палаца белакаменнага падаўся. Падышоў пад тое акно, дзе спальня была, і як загаласіў па пане хаўтурную:

Скора, скора, паночку,
Стане дзень табе ночкай,
І ў дамавіне дошкі
Сціснуць пану ножкі,
Што ніколі не ўстанеш,
На Гаўрылку не глянеш
Адным вокам хітрым,
Другім вокам сквапным.

Ды так жаласна спяваў Гаўрылка, вярба побач расла, і тая заплакала. Прачнуўся пан, разгневаўся, што па ім жывым Гаўрылка хаўтурную спявае. Пан той, як і ўсе паны, вельмі смерці баяўся.

Загадаў ён служкам Гаўрылку розгамі адлупцаваць. Наляцелі служкі, збілі Гаўрылку на горкі яблык. «Ну,— думае пан,— не прыйдзеш больш пад акном галасіць».

А назаўтра раніцай прачнуўся пан ад Гаўрылкавага голасу. Глянуў у акно, а пад ім Гаўрылка стаіць і хаўтурную спявае:



Назаўсёды, паночку,
Стане дзень табе ночкай...

І так жаласна Гаўрылка спявае, што дрэвы наўкола аж рыпяць ад жудасці.

Яшчэ горш разгневаўся пан, загадаў служкам збіць Гаўрылку на горкі яблык і ў склеп пад замок пасадзіць.

Сам Гаўрылка быў невялічкі, а голас — дай божа кожнаму. Што там дзяк з яго пеўчымі! Спявае Гаўрылка па пане хаўтурную, а па ўсіх харомах погаласкі ідуць, аж палац стогне.

Бачыць пан, не дапамаглі розгі. Кары не можа на Гаўрылку знайсці. Вырашыў па-добраму з ім пагаварыць. Паклікаў да сябе ў палац і пытае:

— Што я табе, Гаўрылка, зрабіў благое?

— Ты ж, пан, бульбачку маю адбіраеш.

Надумаўся пан абхітрыць Гаўрылку:

— Ну які я пан? Такі ж самы чалавек, як і ты.

— Па мне,— сумеўся Гаўрылка,— хто не робіць, пад'еўшы і п'ян, той і пан.

— Я не раблю?! — здзівіўся пан.— Ты ж без мяне прапаў бы. Зямля мая, ты кормішся з яе, а я над табой Богам прыстаўлен. Мужык ты цёмны, без нагляду прапаў бы.

Бачыць Гаўрылка, не перагаварыць яму пана. Вучаны! І ён як грымнуў хаўтурную на ўвесь голас:

Ай, ніколі не ўстанеш,
На Гаўрылку не глянеш
Адным вокам хітрым,
Другім вокам сквапным...

Клікнуў пан служкаў, выкінулі яны Гаўрылку ў двор, аж той, бядак, у зямлю носам зарыўся. Падняўся Гаўрылка, з носа кроў цячэ, а ён хаўтурную па пане спявае.

Загадаў пан служкам вярнуць Гаўрылку.

— Добра,— кажа яму,— я пан. А жыццё такое: круль крулюе, пан пануе, а Гаўрылка бедны заўсёды гаруе. І што ты мне зробіш?! Нічога! Толькі бяды нажывеш.



Хацеў Гаўрылка хаўтурную ў адказ заспяваць, ды служка яму рот далонню закрыў. А пан падумаў, падумаў і кажа:

— Нябось, дзеткі галодныя. На вось,— і дае Гаўрылку грошы ў паперцы,— купіш селядцоў у Абрама, дзетак пакорміш.

Узяў Гаўрылка тую паперку, купіў селядцоў, дзетак накарміў. Сам не паеўшы астаўся. А як грошай не стала, да палаца кінуўся.

Пан як убачыў Гаўрылку, насыпаў мех грошай, аддае яму і кажа:

— Каб не чуў я больш твайго голасу паганага!

Ды Гаўрылка ведаў, што рабіў. «Мой ты панок, на чужы раток не накінеш платок». Але толькі так падумаў, пану нічога не сказаў. Грошы забраў, суседзям раздаў, сабе крыху пакінуў.

А як беднякі дачуліся, што пан так Гаўрылку ўзнагародзіў, назаўтра раненька, каму трэба было, а каму і не — усёй ваколіцай сабраліся каля панскага палаца і як загаласілі па пане хаўтурную, ажно ў Кіеве спыталі: «Па кім гэта?»

Пан, вядома, прачнуўся, але не верыць вушам сваім, думае — жахі сняцца. А ў акно глянуў — і рук сашчапіць не паспеў, з упуду і памёр.

Так і зжыў Гаўрылка са свету пана.



# Фількава грамата

*Памяці Уладзіміра Караткевіча*

Бывае, здарыцца, юшка і без Дзям'яна зварыцца. Часам жа, як Тэкля ні таўчэцца,— яечня не пячэцца. Казка не яечня, казаць не канечне, а слухаць... і падаўна як хочаш, тым больш, калі на той сук, дзе сядзіш, пілу точыш.

І ўсё ж, хто казкі і бацькі не слухае, той у пальцы дзьмухае.

...Пры цары Гароху, а мо і пазней троху прыйшоў Кастусь у Лу́жкі на кірмаш. Там люд сабраўся не кволы: багаты, гуллівы і проста вясёлы. Купіць, прадаць, цану збіць, узняць; дзівакоў на бойку звесці і, ім жа добра зрабіўшы,— разняць.



Сідар там казу прадаваў, Агата — маліны, Ібрагім — мандарыны, Глеб — хлеб. Заблоцкі на мыле зарабляў, Каміла мяняла шыла на мыла, а Цімошка задарма аддаваў гармошку.

Словам кажучы — усяго было: пер'е з зайца, шкура з пеўня, пустое, парожняе, мёд, лёд — таксама ж не вада, але за кукіш купіш, з ім і дамоў вернешся. Пра тое і Сямён, божы чалавек, казаў. Хадзіў ён з торбай праз плячо і ўсё пад нос бубніў, але каб і людзі чулі: «Што дарага, то міла, а што дзешава, то гніла. Эх, на патэліне тлуста, у катле густа, ды ў кішэні пуста».



Дзям'ян... у яго капейка шчарбатая, затое ж і муляецца ў кішэні, дык ён з раніцы... харошы. Падышоў да Сідара і казу нахвальвае: «Добрай масці твая карова».

Вядома — кірмаш! Ніл Ягора аб'ягорыў — абадраў, як ліпку, за лапці лазовыя, Якуб Ніла абскуб за боты няновыя. Ды таргуюцца ж. Хочаш — глядзі, а не — вушы не развешвай, далей тупай. У рукі ўзяў — лож астатні грош!



Разглядае Кастусь дзівы кірмашовыя. Раптам бачыць: стаіць адзін, з Дзям'янам жартуе, Тэклі ўсміхаецца, Агаце падморгвае, сам жа ў Сідаравай кашулі рукой шнарыць. Злодзей, і да папа не хадзі!

Злаўчыўся хлопец і цоп яго за руку! Ды не паспеў і вокам моргнуць, як той ірвануўся, крутнуўся, Кастуся ж за руку і на ўвесь кірмаш крычыць:

— Каравул! Папаўся, хто ад астрога хаваўся. Гэта ж ён з нашага кішэня цягне, у клопат заганяе. Праз паганца і жыццё цяпер такое: на хлеб збярэш — на лапці не хапае, кафтан пашыеш — спаць не пад'еўшы ляжаш.

Ведаў Аўдзей-Зладзей, што і як гаварыць, каб людзі чулі.

Ягор тут жа схапіў багор. Пахом прыбег з абухом, за ім — Ібрагім. Цімошка ўжо біў Кастуся гармошкай, Заблоцкі, як певень, вакол скакаў, абяцаў карак намыліць. Не казаў толькі каму. А Тэкля словам секла:

— Каб жа цябе, зладзюгу, вадою мачыла, перуном глушыла, сонцам пражыла. А гарэць жа табе смаляком, па рацэ плысці камянём, зляцець адсюль пухам-прахам!

Што ж усемярых аднаго біць? Урэзаў поўху Цімох — збіў з ног. Аўдзей-Зладзей тут як тут. Ботам пад рабро таўчэ і, каб людзі не пачулі, шыпіць: «За ўсё жыццё бяды не вытапчаш, папярок мне стаўшы. Хваробу ад пабояў табе і знахар Яроська не сшэпча, ні вадой не змые, ні ў балота не сашле. Вось табе... вось... не сунь нос у чужы авёс, калі не просяць!»

Збілі людзі Кастуся на горкі яблык, нібы астрожніка заклятага, самі па справах разышліся.

А куды ў той час глядзеў цар Гарох?! Ды ўсё туды, дзе рос мох. І заняты ён быў — лавіў блох, еў за трох, а што трэба ўбачыць — не мог.

І толькі жабрак Сямён схіліўся над хлопцам і кажа:

— Падымайся, гора-бяда. Не знайшоўся, відаць, на свеце такі маладзец, каб указаць, хто злодзей, хто не, хто долю ў жыцці знойдзе, каго ж бяда не міне. Табе, хлопча, да Фількі б пайсці, грамаце жыццёвай падвучыцца. Было так, ёсць і будзе, кажа Філька, хто век працуе, мазаля не чуе, дома і жыве, калі ночку начуе... а іншы — зверху кідкі, знутры брыдкі, пры блудзе, ды яго хваляць людзі. Таму хочаш жыць — умей круціцца, у крыніцу плюнуць, з яе ж і напіцца. Бо нічога не зменіш. Не станавіся ўпоперак, а ідзі-плыві ўздоўж. Дзе бокам, дзе скокам, так і праціснешся праз усё жыццё да свайго апошняга дня.

— Я ж не праціснуцца прыйшоў у свой першы, а каб жыць...— прастагнаў Кастусь.

— Э-э, хлопец...— пачаў быў Сямён, але ўбачыў Аўдзея, махнуў рукой і пайшоў сваёй дарогай.

Падняўся Кастусь з зямлі. Бакі баляць, і сорамна, і крыўдна, і скардзіцца няма каму. На душы цяжка, нібы бацьку спадмануў.

Пабрыў ён па кірмашы далей ад месца жорсткага. Раптам бачыць: два чалавекі сякерамі адзін у аднаго над галовамі круцяць. Нібы жартам, нібы ўсур'ёз. Нібы дзеля страху, а сякерышча рассохнецца — быць бядзе. Навокал жа людзі, справы пакідаўшы, таўкуцца, мужыкоў да міру заклікаюць.

Кастусь, да трох не лічыўшы, да людзей кінуўся і паміж імі стаў:

— Вы што! Сякера зляціць, а па людзях жа і шарахне!

Тыя ад нечаканасці знямелі. Але тут жа адзін з іх Кастуся за каўнер і тузануў уверх — людзям на пацеху:

— Што яшчэ за разумнік знайшоўся! Відаць, дурман нюхаў! Ану, дыхні! Адкуль прыйшоў? Калі нарадзіўся?! Хто бацькі?!

І, не чакаючы адказу, размахнуўся здаравяка і закінуў Кастуся проста ў лўжкаўскі сметнік. А наўздагон крыкнуў:

— Бачна адразу — не нашага заводу!

Першы зарагатаў Пахом. За ім — Ібрагім. Захіхікала Агата. Ухмыльнуўся Заблоцкі. Цімошка ж аб зямлю гармошку, сам побач лёг і ад рогату ледзь не здох.

А Тэкля словам секла:

— Каб жа цябе, не пана, ды, як пана, на насілках насілі! Каб на твой сяннік чэрці дрот касілі!..

Засмяялі людзі Кастуся, ды так, што ў роспачы вялікай думаў ён: «Хай бы яшчэ раз білі, чым такі сорам». І толькі жабрак Сямён паспачуваў:

— Не з малым, хлопча, розумам у сварку вялікіх пхнуцца. А ведаючы Фількаву грамату, з усімі... паладзіў бы. На людзях, братка, цяпер вушы падняўшы хадзі, недачуеш як, куды і калі ісці — правучаць.


PURGEN

— А сам чаму з торбай ходзіш, калі такі мудры? — пытаецца Кастусь.

Усміхнуўся Сямён і зусім не сваім голасам адказаў:

— Тэорыю ведаю, а для практыкі... душа мая далікатная.

— Чаму ж мяне вучыш?

— Шкада дурняў! — раззлаваўся Сямён.— А жабрацкая торба для цябе надта цяжкая... або лёгкая. Як жыць будзеш?

Са сметніка куды цяжэй выбірацца, чым ад пабояў уставаць.

Пайшоў Кастусь далей ад месца брыдкага. Ідзе па кірмашы і думае: «Што ж, Сямён праўду кажа. Але дакуль жа будзе так, што праўда калясом круціцца, а крыўда паняй на ёй едзе, ды яшчэ і ў карэце няпростай?!»

Вырашыў хлопец хутчэй адсюль ісці, ды ў каго дарогу пад Вільна ні спытае — ніхто пра такую як бы і не чуў.

А тут бачыць, стаіць на карчы дубовым чалавек на плошчы і чытае з паперы так:

— Спасціг я сэрцам сваім сёння тое, да чаго вам і ў думках на вярсту не падысці і паслязаўтра. Не намі пастаўлены купал нябесны, пралажаны рэчышчы жыцця: ідзі па іх не гаспадаром, а аратым, бо спытаюць, колькі заплочана за тваё з'яўленне на свет. І адказ будзе — ані граша! Калі ж аддасі доўг за гэткую міласць?! Таму сямёра павінны есці хлеб аратага і на тузін каваць грошай каваль. Не выпускай слова дзёрзкага перад старастам сваім, бо даўно ўжо рашылі і пастанавілі, што яго праўда — вартавы, а твая — палоннік. Адвярніся і глядзі ў той бок, дзе дышаль закону, калі стараставы людзі забіваюць суседа або цягнуць у свой двор авечку, якая хай сабе і не належыць ім.

Заслухаўся Кастусь — прыгожа чалавек гаворыць, мілагучна. А тут з натоўпу, што вакол карча сабраўся, хтосьці таўхель яго пад бок і шыпіць на вуха:

— На, адзень! — і падае акуляры з ружовымі шкельцамі.

— Я і так бачу,— здзівіўся Кастусь.

— Не так бачыш!

І на гэты раз так пад бок штурханулі, што больш пытацца не выпадала.

Як акуляры начапіў, забыўся Кастусь нават пра лу́жкаўскі сметнік. Добрае жыццё! Не жыццё, а маліны на Каляды!

— А хто ён? — пацікавіўся Кастусь.

— Цішэй ты, сам Філька.

Слухаў Кастусь, слухаў словы прамудрыя, а тут нос пад дужкай засвярбеў, нібы балячка на ім села. Хацеў папправіць акуляры, а яны ні з месца. Прыраслі. Раззлаваўся хлопец — не любіў каб хай сабе і нос, а тым больш вочы — пад прыгнётам былі. Ірвануў акуляры — ну, са скурай і адлупіў. Шкельцы ўдарыліся аб брукаванку, разбіліся, а з іх такая груда шкла атрымалася, нібы з воза бутэлек.

Агледзеўся навакол, а да карча людзей усё прыбывае. Таўкуцца, як тыя парабкі на панскім полі, якім сказалі, што і калі зрабіць, а пра плату змоўчалі. Тады вядома — усе працуюць, аж пот з ілба цурком, а што зрабілі — і за пяць год не адшукаеш.

У ружовых акулярах Кастусь толькі чуў і бачыў, а без іх — думаць пачаў. Ды яшчэ са злосцю — балюча ж, і муха насядае. І адчуў у сабе жаданне небывалае — Фількаву грамату перад людзьмі выкрыць. Ды не ведаў, што для гэтага многа сілы патрэбна. І не той, што дубы ламае, балоты высушвае. Тут нават Полацкі Якаў, ад якога і крыжак вякаў, не падмога. Пахом вунь як Фільку слухае, бо яго мех не смехам і не простым арэхам поўны. Агата таксама не вінавата, што яе хата Тэклiным дабром багата — то і слухае са спакойнай душой. Клім і Ібрагім таксама згодны з ім.



Кастусь, малады, жыццём не навучаны, вазьмі і крыкні на ўвесь кірмаш:

— Лжэ ваш Філька! Абяцае жыццё светлае ў будучыні, гэта значыць пасля апошняга дня жыцця на зямлі гэтай. Тады, вядома, жыві, ды не хачу! Усе ж аднолькава прыходзяць і пакідаюць гэты свет. Чаму ж тады зноў Тэкля, як цяперашняя праўда, усё жыццё калясом круціцца, а Агата, як вечная крыўда, паняй на ёй едзе?!

Свет не перавярнуўся. Людзі як бы і не чулі слоў Кастуся. Тады з апошніх сіл што было духу выгукнуў хлопец сваю праўду. І зноў ніхто ўвагі не звярнуў. Толькі Пахом аперазаў яго прыхаваным на ўсялякі выпадак сёмым мяхом. Як ад мухі назойлівай адмахнуўся.

І тут з жудасцю смяротнай адчуў Кастусь, што ён паміж людзей — пустое месца. А што можа быць страшней за гэта на зямлі?

Звесіў хлопец галаву і пабрыў ад месца прамудрага куды вочы глядзяць. У каго з сустрэчных ні запытае, дзе ж выйсце,— ніхто адказаць не можа. Толькі плячыма паціскаюць: дзівак чалавек, якое выйсце ён шукае?

А паміж людзей, якія не ведаюць, дзе выйсце, заблудзіць страшней, чым у лесе з самім Люцыпарам.

Цімошка ж ужо некаму аддаў гармошку, таму быў добры, вясёлы, ён і параіў Кастусю:

— Рабі — як Філька кажа, насі — што Філька звяжа, вось табе і шчасце-выйсце. А калі яшчэ і грамату яго пахваліш — бакі цэлыя будуць, а жывот тугі!

І раптам... Хто не паверыць, хай на сабе праверыць або пад Лу́жкі ў Чарапы збегае, у Яроські запытаецца.

...З Кастусём здарылася, як бывае толькі ў казцы — не на кірмашы ён, дзе паміж людзей заблудзіў, а на беразе Дзвіны. На другім жа — дзяўчына хараства небывалага.

Як гэта небывалага? Ды зусім проста — калі яна маладзенькая, не вельмі бойкая, але і не ціхенькая, з людзьмі ветлівая, з бацькамі далікатная, да працы ахвочая — то і прыгажуня.

Першы раз яе Кастусь бачыў, а нібы ўсё жыццё ведаў.

Расцвілі дзікія ружы — усміхнулася дзяўчына.

Ручай зажурчэў — загаварыла яна:

— Шчаслівы лёс — гаварыць толькі праўду, тыя словы, што людзі ведаюць, але хто сказаць не можа, хто не ўмее, а іншы не хоча. Спяваць тую песню, якую сэрцы людзей чакаюць, таго не адчуваючы.

Хвалі ўзняліся на Дзвіне, а над імі вецер нёс да Кастуся словы:

— Гаварыць праўду — і гаварыць праўду, любячы людзей і ненавідзячы ў іх тое, што яны прагнуць зжыць у сабе,— не адно і тое. Ведаеш, ад чаго захад чырванню залівае? Ці не саромеецца неба прайшоўшага на зямлі дня?!

Палынамі вецер шамацеў:

— Горкі лёс — быць усюды гнаным, несучы ў руках трапяткое сэрца, аблітае крывёю праўды... не быць прарокам у айчыне сваёй...

Слухае Кастусь голас чароўны і не можа зразумець — спіць ён, трызніць ці наяве ўсё адбываецца. Як русалка, вабіць яго да сябе, за сабой прыгажуня, і ён робіць крок, другі... Але колькі наблізіцца, столькі яна адступіць.

— Хто ты?

— Я свет твой і цемра. Каханне і нянавісць. Меч і шчыт. Шыпы і ружа. Я — тая, якую шукаў не адну веснавую ноч, сніў у першых юнацкіх снах,— шапацела голлем бяроза.

Адчуў, зразумеў хлопец — знікне зараз дзяўчына, растане як туман — ці ж можа такое шчасце быць доўгім, прыйшоўшы само па сабе?

— Як імя тваё?

— Я не маю імя,— задрыжэла лісцем вярба плакучая,— заві мяне Вольга... Не гэта галоўнае. Не забудзь... Няма ў абяздоленага на гэты час іншай зброі, як слова яго. Але слова трэба ўмець знайсці і сказаць. І станеш царом. Будзеш валодаць не золатам і плёткай, а сэрцамі людзей... зямлі.

— Не трэба...— у роспачы шэпча Кастусь.— Толькі ты, адзіная. Ты знікаеш? Застанься... Не пакідай...



Вось ужо хлопец ледзь угадвае ўдалечыні яе развітальную сумную ўсмешку. Ёй не хочацца расставання, ёй балюча, як і Кастусю.

— Не мая віна...

Не цяклі, застылі воды Дзвіны.

— Дзе знайсці цябе?

— Людзей не мінаючы, ідзі па зямлі сваёй роднай.

— Але ж як гаварыць з імі буду, словам не валодаючы? Як навучыцца?

— Гэта і ёсць самае цяжкае на свеце.— З-пад зямлі, з-пад кургана-магілы песняру-гусляру прыглушаным выдыхам данеслася да Кастуся: — Плата за слова не золата, а кроў. Пакуты і здзекі. Песняроў шмат, а дзе ж мужнасць!

І зноў наваколле гучала-гаварыла чароўнай музыкай-словамі:

— Стань першым жабраком і жабраком апошнім...

Сонцам стань, яго пякучай праўдай, што спальвае і дае жыццё. І не сонцам, хоць бы промнем яго.

Месяцам адчуй, як цяжка і сорамна яму вечна несці на сабе адбітак грэху зямнога: стаіць брат над забітым братам.

Светам зоркі стань, той, што падае, згараючы ў імгненне,— яна ж прыносіць шчасце.

У рабінавую ноч у чыстым полі стой, пакуль маланкай не прашыеш цемру... хоць бы водбліскам яе.

Стань заходам, калі меркне на зямлі святло і наступае ноч, і ты нясеш яе. Жахніся цемры сваёй і людской і тут жа стань яснай раніцай,— сілу і радасць узыходзячага сонца людзям несучы.

Плынню ракі між лугоў сенакосных праплыві і цяжкасць муці адчуй, якую Дзвіне трэба несці, ачышчаючы сабою людскія брыдоты. І стань берагам, якім сотні гадоў з надзеяй ішлі да Святой Сафіі прыгнечаныя. Стань вусцем і вытокам, рэчышчам і вірам. Крыгай сыдзі ў мора, каб там растаць, не пакінуўшы па сабе следу.

Праз туман, якім ахутаны твой край, убач святло ісціны.

Прайдзі там, адкуль ніхто не вяртаўся, не вярніся адтуль, дзе шлях пад сілу дзіцяці.

Стань канцом і пачаткам баразны. Аратым зямлі. І, збіраючы багаты ўраджай, будзь галодным, ірвучы спелыя грушы, не дай з'есці ніводнай брату. І, не працуючы, май поўныя скрыні дабра.

Здолееш гэта — і я з'яўлюся перад табою, каб адкрыцца. Мужнасці табе... Цярпення...

І дзяўчына знікла, як зорка на небе згарае ў адну хвіліну і назаўжды. Толькі рэха данесла:

— Вольга я... Во... л... я...

Кінуўся Кастусь у ваду, Дзвіну пераплысці і дагнаць дзяўчыну. У вір хлопца зацягнула, закруціла — тут бы і канец, ды сама вада, нібы пашкадаваўшы, выштурхнула з глыбіні і хваляй на бераг выкінула.

Зірнуў хлопец на сонца — вось хто ўкажа шлях да Вольгі!

Але тут жа адвёў вочы — святло сонца асляпіла і апякло, як сама праўда. Можа, яно і ўказвае шлях зблудзіўшаму, ды не кожны ўбачыць.

Спытаў Кастусь вандроўніка: дзе сцяжынка, ідучы якой прыйдзеш да Вольгі?

Не ведаў прахожы. Паспачуваў, але, адышоўшы, пашкадаваў хлопца:

— Такі маладзенькі, а вар'ят.

Знясілены няўдачамі Кастусь распластаўся на сырой зямлі... Не чуць яму больш ніколі чароўнага голасу Вольгі, не бачыць яе блакітных вачэй, не крануцца рукі...

Раптам чуе над сабою словы:

— Што, хлопча, заціснула нуда? Не ведаеш зноў выйсця? А ці не забыўся ты, што трызнілася?

— Не трызнілася, наяве ўсё было,— адказаў Кастусь.

— Верыш? — зазірнуў яму ў вочы жабрак Сямён.— У тым і шчасце тваё. Са мной пойдзеш?

Блізка ці далёка, доўга ці коратка ішлі яны і прыйшлі ў вёску. З аднаго вялікага і багатага дома на паўмілі ўкруг бегла музыка. Сямён, як і належыць божаму чалавеку, стаў у парозе, шапку зняўшы.

Госці загаманілі:

— Сямён Вялеўскі прыйшоў... Пацеха...

— Сямён, заспявай «Дзеўкі лазеньку тапілі»! Насыплем поўную торбу гасцінцаў.

— Музыкі, урэжце, Сямён «Юрачку» паскача...

— Давай... І табе ўложым,— нядобра жартавалі хлопцы. Выхапілі ў жабрака торбу і з рогатам некуды збеглі.

...Калі Кастусь бачыў, як Сямён выкідаў з торбы камяні, нібы ўспомніў словы Вольгі.

Наваколле гучала музыкай-словамі... Дождж плакаў... Сабакі вылі...

— У горкую жабрацкую торбу не хлеба прасі — збірай радасць людскую... Не сабраць яе, як слёзы сірот і ўдоў, што сцякаліся ў брацкія магілы і перапоўнілі іх за ўсе войны, што адбыліся на зямлі па віне правіцеляў.

Выпі кубак вады, пададзены тым, хто памірае ад смагі...

І калі стане торба нястрымна цяжкаю — словы ўдзячнасці людзям знойдуцца самі. З іх пачынаць жыццё, з імі жыць, іх сказаць, пакідаючы зямлю...

Так і прайшоў Кастусь з Сямёнам праз вёску, жабрак хлеб збіраючы, хлопец — хто дасць ад шчырага сэрца.

А за вёску выйшлі — адкуль ні вазьміся наляцелі вятры сілы небывалай. І дашчэнту разбурылі той дом багаты, дзе над жабраком пацяшаліся.

— Ці не чараўнік ты? — насцярожыўся Кастусь, убачыўшы такое.

— Не,— супакоіў яго Сямён,— людзі ў тым доме абразілі не толькі жабрака. Каменю ніколі не быць хлебам. Вось і раз'юшыўся Пярун.

Была рабінавая ноч.

Пярун біў у Кастуся, кідаючы коп'і стрэл-маланак, але з Сямёнам страшна не было. І маланкі над самымі іх галовамі ламаліся ад смеласці людзей. І білі побач.

Імклівасць і сілу святла маланкі, што паласавала неадольную для чалавека цемру ночы, убіраў у сябе Кастусь. І ў адно імгненне здалося яму, што і сам ён можа паласнуць маланкай па цемры, ахінуўшай зямлю.

Але ў гэты час жабрак Сямён крануў яго за плячо:

— Што стаіш? Торба пустая. Трэба ісці.

Тут хмараў не стала. Навальніца пайшла бокам.

Ішлі яны праз туман.

І раптам Кастусь убачыў дзяцей. Яны гулялі ва ўсе гульні, у якія звычайна



гуляюць дзеці. Толькі ў вайну не гулялі. Яны і не ведалі, што была калісьці такая гульня.

Многае бачыў і зведаў Кастусь, ідучы з Сямёнам.

...Сонца вочы сляпіла, абпальвала, а Кастусь упарта ішоў, ішоў за ім услед, каб не ўбачыць тры дні і тры ночы заходу. Глядзець на сонца — найвялікшая асалода і пакута. І ўжо промнем сонца ён змог бы заглянуць у дзіцячую калыску або памчаць па свеце ў пошуках Вольгі...

Але ў гэты час жабрак Сямён крануў яго за плячо:

— Пара...

Сонца ўжо не сляпіла вочы Кастусю. Месяц адкрыў загадкі двух братоў і кургана-магілы. Ведаў хлопец, калі грымне гром і будзе ясная раніца... Многа чаго ведаў, аднаго не — дзе знайсці Вольгу.

І вось аднойчы выйшлі да ракі.

— Гэта ж Дзвіна,— узрадаваўся Кастусь.

Глянуў на другі бок ракі — там стаяла дзяўчына хараства небывалага. Вольга!

Звесіў хлопец панура галаву — адразу ўсё зразумеў.

— Ты і ёсць ісціна? — запытаўся ён у дзяўчыны.

— Берагі Дзвіны могуць сысціся толькі ў вытоку. Назад пойдзеш?

— Не. Вечна імкнуцца да цябе і ніколі не сустрэць. Шчасце і пакута...

— Ты ведаеш цяпер назву ўсяму на свеце... Твой лёс іншы, чым каханне да адной.

Ізноў загаварыла наваколле песняй-гімнам:

— Сказаць, каму трэба, як бальзаму на смяротную рану, слова спачувальнае. Іншым — мудрасці, многім — мужнасці.

І ўсім астатнім — каб хоць як мага менш прыносілі яны пакут людзям у сваёй пагоні за сіняй птушкай.

Слова спачувальнага старому, калі яго пакінуў сын; маці, калі загінуў воін; сірацінцы... І слова праўды... Так, прыйшоў час казаць праўду! І Кастусь пайшоў...

А як пад Лу́жкамі з каляровымі стужкамі конікі скакалі! Давезлі яны Кастуся да Яроські.

Захар, вядома, тут жа людзей склікаў.

Цімошка прынёс гармошку.

Глеб прынёс хлеб.

Ягор прынёс кагор.

Заблоцкі зварыў клёцкі.

Клім прынёс сыру клін.

Ібрагім прынёс мандарын.

Толькі Аўдзей схаваўся ад людзей.

А Тэкля сказала як адсекла: лепшага жаніха, як Кастусь, ва ўсёй акрузе не знайсці! Дзе ж нявеста?

І я там быў, нічога не піў, бо не далі.

## Зачараваная гаспадарка

Казку казаць — не снапы вязаць. Языком малоць — што моркву палоць. Калі ёсць ахвота, сядай каля плота, слухай, матай на вус... Жыў ды быў адзін беларус. Багацце меў, бо стаяў ля хаціны хлеў. Тут жа пуня для сена, на дровы павець. Што яшчэ трэба мець? Во-во, здагадлівы: карову, цялушку, курэй... ну і гэтак далей.

І гэта не ўсё. Што даражэй любой навукі? Вядома ж, здароўе і моцныя рукі. Меў Гаўрыла і тое і другое. А яшчэ... за лесам луг, перад возерам агарод, у хаце печ, на печы кот, у святліцы калыска, у калысцы — касец. Пакуль з соскай, але маладзец. І яшчэ два сыны ў Гаўрылы: яны бацьку ва ўсіх справах падмога — і на кірмашы з цыганом старгавацца, і за камель добра ўзяцца. Работу зробяць так, што і перад суседзямі не сорамна.

З тым і жыў Гаўрыла (пад Полацкам). Ад вяселля да наваселля, ад радзін да хрэсьбін, ад свята сонца да свята марозу: з дня ў дзень, з году ў год працай славіў свой род.

Пакорны быў не толькі людзям. Бывала, дождж ідзе — ён кошык пляце. А на свята ў Гаўрылы гасцей поўна хата. Затое ж калі работа — упоцемках абуваў-разуваў боты. Сала з часнаком, з хрэнам еў, малаком запіваў, мабыць, таму на марозе пацеў і ў спякоту не млеў. Ладнó, калі здаровы — усё адно, ці фасолю лушчыць, ці ехаць па дровы.

З кожным годам усё лепш і лепш жылося Гаўрылу. Нават выпадкова часіна вечарком пасядзець на лавачцы ў двары і паразважаць, чаму лісце дрыжыць у асіны, а ў адлігу далёкі лес сіні, чаму камары таўкуць мак, а то на захад сонца глядзець проста так.

Ды якая ж казка, калі ўсё добра! У казцы, як і ў жыцці: добра, добра, а потым як здарыцца, хоць у бубен бі, хоць у жалейку грай, а бядзе тое, па што прыйшла,— памры, а аддай. То не ў бульбе лебяда, а бяда дык бяда. Дык вось слухай: падчаравалі Гаўрылу. Што-што, а гэта даўней на Белай Русі ўмелі. Хто ячмень малаціць, хто сеяць авёс, а хто ў суседаву шчыліну ўторкнуць свой нос. Ці там ведзьма шапнула, а можа, нячысцік накруціў залом (такіх, вядома, калі зловяць, частуюць калом). Ды паспрабуй укараўуль, яны ж пра тое ведаюць. Ёсць жа на свеце людцы: такі ў жвіры рыдлёўкай капне, і то чарвяка парэжа! Знаць, у яго на раду шкадлівасць упісана.

І пайшло ўсё наперакос. Залом быў ці не залом, а толькі карова ў Гаўрылы стала казой: пойдзе гаспадар карміць худобу — стаіць яна, жвачку жуе. Толькі вочы занадта сумныя, як бы што сказаць хоча і не можа. Не ўмее. А прыйдзе жонка Гаўрылава з даёнкай — у хляве не карова, а каза. З казы ж малако вядома, хоць ты яе па шэрсці гладзь, хочаш — пугай лупцуй. Падоіць гаспадыня казу, даёнку хусткай накрые і бягом дахаты, каб суседзі такі сорам не ўбачылі.





Ды ніяк не народзіцца той чалавек, які б здолеў свет спадмануць: там побач з хлявом алешына расла, на ёй сарока сядзела, усё гэта згледзела і панесла па свеце: «Каза барадой трасе, а Гаўрылава жонка пустую даёнку дамоў нясе». Сарока была той пароды, калі што добрае ўбачыць, тады маўчыць, калі ж у каго бяда, тады кпіць.

Ды адна бяда не ходзіць: пасее Гаўрыла жыта — вырасце гірса. Сажне ячмень — то каласы пустыя, то зялёненькія, што і на печы пры патрэбе не прарастуць. Свіння апаросіцца — Гаўрыла тузін сысункоў налічыць. Пойдзе гаспадыня іх малаком паіць: і лічыць няма чаго — адзін ля маткі бегае і той як на чужых нагах. Косіць Гаўрыла луг — трава мядовая, духмяная, хоць чай вары. Зімой жа ад таго сена аж дух выварочвае. Квактуху гаспадыня на яйкі пасадзіць — прывядзе куранят плойму, а як у пёры ўлезуць — адны пеўні. Адкорміць Гаўрыла парсюка пудоў у дванаццаць, асвяжуе — парася. А зверху на ўсе напасці пацукі ў двары завяліся. Гаўрылаў кот Баюн сабе памаўзуе, па гаршках вяршкі злізвае, пацукі сабе ў нару цягнуць, што толькі пад лапу трапіцца. Кот Баюн сядзіць на печы і чаруе сам сябе сваімі ж песнямі, а ў пацукоў у іхніх норах усю зіму паміж сабой дзяльба ідзе — муку на крупы, гарох на жыта...

З той прычыны ў Гаўрылы цяпер і плуг не арэ, то дождж у дварэ, то сонца пасьпяшаецца ўзысці, а куды ж без расы касіць ісці?!



У доме сваркі, калатня пачалася — Гаўрыла жонку ў бедах вінаваціць, яна гаспадара кляне, а на стале акраец хлеба ўсё меншы і меншы становіцца.

Сам не свой Гаўрыла — па двары бегае, ад адной работы да другой кідаецца. На ўсё наваколле святая нядзеля ў звон б'е, людзей на свята склікае, а Гаўрылу і адпачыць часу не стае. Ад гасцей цураецца, да суседа не завітаецца. Сыноў работай змучыў так, што ім і свет нямілы стаў. На худобу і тую злосць гоніць: «Каб у цябе морда не ўніз была, а ўгору, сама б зімою па лесе ежы знайшла!»

Адна ўцеха ў Гаўрылы: сыны як волаты выраслі. Два старэйшыя — разумныя, і малодшы — у жыце хрышчоны, Алесем нарачоны, у лузе спавяданы, хлебам гадаваны, працай навучаны. Рукі ад зямлі чыстыя, душа ад неба светлая. Касой махане — бацькавых два пракосы зойме. Ну, не два, дык паўтара, гэта ж казка! Вельмі добры толькі быў Алесь, а такому не ўсюды жыць лёгка.

Палюбуецца Гаўрыла на сыноў, душу ўсцешыць, але як уздумае, што і ім біцца-таўчыся над зачараванай гаспадаркай, як прывязанай карове на вытаптанай пожні,— месяц спаць замінае. І надумаўся ён сыноў выправіць з дому — свет вялікі, можа, там сабе шчасце-долю знойдуць.

Цяжкім было развітанне: цёмная хмара сонца закрыла, віхор узняўся, вось-вось з хаціны дах сарве, плот зваліць, ранетку-яблыню з каранямі выверне. Але тут і дождж пайшоў, шчаслівага шляху напрарочыў.

Сказаў бацька сынам: «Не ешце дармавога хлеба — бокам выйдзе. І не заставайцеся там, дзе здалёк гаварыць пачынаюць, бо чым канчаць — невядома».

Ішлі браты сцяжынкай, прасёлкавай дарогай, шырокім бальшаком. Доўга ці коратка ішлі — прыйшлі ў Полацк (даўно гэта было — яшчэ стаялі рыштаванні на храме Святой Сафіі).

Ідуць па вуліцы, аж бачаць — палац белакаменны. Над дзвярыма надпіс: «МІЛАСЦІ ПРОСІМ».

Раз просяць — чаму ж не зайсці! Ім і дзверы адчынілі. Сустрэлі ветліва, гаварылі мядова.

Век такога браты не бачылі! Людзей у палацы безліч. Скачуць пад музыку па люстэркавай падлозе ў заморскіх адзеннях. Навакол гоман вясёлы, жарты, смех... Светла і радасна тут, нібы ў лесе вясновым.

Расказалі браты людзям пра бацькаву бяду, а ім лагодна раяць:

— Заставайцеся ў нас. Не знойдзеце вы адказу на сваё пытанне. А калі і знойдзеце, не малым розумам вялікія справы вырашаць!

Агледзеліся браты: у палацы ні касіць, ні жаць — а жыць-пажываць бяды-ліха не ведаючы. Паесці захацеў — рукой узмахнуў, адкуль ні вазьміся, на стале віно — і белае, і чырвонае, мяса рэзанае, бітае, кручонае... Нагой тупнуў — музыка чароўная зайграе, і тады свет белы бачыць не хочаш — як у тумане на лузе; ды не камароў у пракосе карміць, а абцасы-падэшвы не шкадуючы аб люстэрка-падлогу біць! Вокам мігнуў — простым людзям нябачная такая прыгажуня з'явіцца! Лашчыцца, песціцца — шукае, з якога боку да цябе падступіцца.

Прабылі браты ў палацы тры дні і тры ночы. А як адну хвіліну! Іх не гоняць, а самім куды ж ісці?!

Ды вось трэцяга дня адчуў Алесь, што рукі ў яго брудныя,



а памыць не ведае дзе. Ён сюды-туды, у каго ні запытае — палацавы людзі толькі плячыма пацiскаюць і глядзяць на яго, нібы ён пацука з'еў.

Учуў хлопец душой сваёй светлай — пакуль не позна, выбірацца адсюль трэба. Стаў братоў клікаць:

— Хадзем адсюль, пакуль у багну не ўскочылі. Бацька наказваў хлеб толькі зароблены есці.

Сярэдні, Ніл, прыслухаўся, а Глеб і вухам не вядзе, сам жа думае: «Бацька нас шчасце шукаць выпраўляў. Яно — тут. Няма ў мяне ахвоты ў брудным двары гліну мясіць ды гной трэсці».

Алесь з Нілам сталі падымацца з крэслаў, каб пайсці,— і не могуць. Як хто прыляпіў іх да сядзенняў! Ды крутануліся, ірвануліся — праз дзверы і ходу...

І ў добры час! Бо хто ў тым палацы чацвёртую ноч перабудзе — назаўжды там застанецца. Удзень там балі ды гулі, а ўночы такія справы рабіліся, якія лепш добраму воку не бачыць, далікатнаму вуху не чуць. Тады хоць у пельку лезь!

Далей пайшлі Алесь і Ніл па Полацку ўдвух. Доўга ці коратка ішлі — стаіць на іх шляху палац гранітны, над дзвярыма надпіс: «МІЛАСЦІ ПРОСІМ». Раз просяць — як абмінуць? Ім і дзверы адчынілі. Сустрэлі паважна, гаварылі мудрона. А калі браты расказалі пра зачараваную гаспадарку, адказалі так:

— Такую бяду рукамі не развесці. Але ўвечары ноч чакаюць, справу складаную не распачынаюць. А вось раніца! Як на той добры бок устанецца, то што ўчора была незрухомая бяда — стала крынічная вада. Пажывіце ў нас тысячу дзён і тысячу начэй — мы вам чорную кніжку дадзім, чытаць яе навучым, вось там і знойдзеце, дзе той чараўнік жыве і якім спосабам перамагчы яго.

— Каб даведацца, чаму не родзіць жыта і лён,— не трэба вучыцца тысячу ночаў і дзён,— адказаў людзям Алесь.





А Ніл, як бы і марыў усё жыццё навучыцца тую кніжку чытаць,— у палацы застаецца.

— Хлеб тут не дармавы, мазгамі варушыць — не пустым аб парожняе агонь імкнуцца здабыць.

Так і развіталіся браты на прыступках палаца мудрасці. Далей Алесь пайшоў адзін.

Тут змяркацца пачало, цішыня навакол такая — альбо радуйся ці нягоды чакай. Ідзе Алесь, а навакол мясціны незнаёмыя, і страх яго апанаваў, як бы вось-вось злыдзень на яго з лазіны скоча і ў горла ўчэпіцца.

Раптам як ішоў, так і ў сцяну каменную ўпёрся, ледзь лоб не расквасіў. Далей, уперад, шляху няма. Кінуўся Алесь у адзін бок, у другі, назад... Колькі крокаў прабяжыць — нібы выйсце бліснe, а перад ім у імгненне сцяна вырастае. Пот халодны ў хлопца на лбе выступіў, па спіне мурашкі забегалі. Цёмна, жудасна — і ад каго літасці чакаць?! Маўчаць халодныя сцены.

Лабірынт гэта быў Змея Гарынавіча, і ніхто адсюль жывы не выходзіў. А калі выходзіў, быў у яго ўжо не свой розум: думаў той не сваімі думкамі, гаварыў не сваімі словамі.

Б'ецца Алесь, як шчупак у нераце, у каменным мяшку — ці ж можа маладая кроў змірыцца з няволяй, гарачае сэрца згаснуць у адзіноце? Здаецца яму, зваяваў бы любое войска, перамог бы любога злога асілка. Але ж з кім сілаю мерацца?! З гэтымі халоднымі бяздушнымі сценамі? Спрабуе ён сцяну рукамі зрушыць-разарваць. Рукі акрывавіў, пазногці з пальцаў сарваў. Ужо і ногі яго не трымаюць, рукі абвіслі, нібы голле

ў ніцай бярозы. І ўжо паўзком — плячом, спінай, а ўсё рвецца хлопец на волю.

А калі зусім знямогся, распластаўся на сырой зямлі. Уверсе неба бачыць, зоркі... Месячык поўны, ясны, жывы, але вельмі далёкі. Зірнуў Алесь на месячык і зразумеў — як далёка ад яго жыццё. Тут і згінуць яму невядомым. Вочы закрыў — і зарагаталі жудасным смехам сцены:

— Ха-ха-ха! Прапаў ты, сын Гаўрылы! Раздушым мы цябе, выціснем з твайго сэрца сок дабрыні, разбавім ім сваю хітрасць, хцівасць і сквапнасць. І будзем гэтым віном белы свет паіць-тлуміць, каб больш такіх разумнікаў не знаходзілася парадкі свае ўсталёўваць на зямлі гаспадара нашага, найчарнейшага Змея Гарынавіча.

Адкрыў Алесь вочы — маўчаць халодныя сцены. І ўспомнілася яму рака, што ля парога бацькавай хаты нясе невядома адкуль свае чыстыя воды ў вечным спакойным задуменні. Такая плынь! Такая магутнасць! Ласкавасць, сіла і чысціня! І ён клікаў яе ў сваім перадсмяротным сне.

І яна прыйшла сваёй несупыннай плынню.

Ачуняў Алесь ад свежасці. І нібы сілы ў яго прыбавілася ў сто разоў. А вада ўсё прыбывала, затапляючы каменны мяшок; жудасны смех непрыступных сцен ужо захлёбваўся, траціў сэнс і моцнасць сваёй фанабэрыстай упэўненасці.

Алесь не спужаўся вады — узрадаваўся ёй. Толькі б хапіла яе сілы! Каб было яе яшчэ больш, больш... Вада ж заліла хітры каменны мяшок лютага Змея і ўзняла Алеся над ім, вынесла яго на квяцісты луг, на травы шаўковыя, мядовыя — такія адным толькі пахам сваім добрага чалавека лечаць, думкі ясняць.

Тут вада спала, вярнулася ў звыклае рэчышча, пацякла сваім спрадвечным шляхам. Разводдзе закончылася.

Алесь жа, як зусім ачуняў, агледзеўся — ля самай Дзвіны ён. На ўскраіне Полацка. Да Святой Сафіі рукою падаць. Тут і раніца новага

дня настала. Па рацэ сонца зіхатнула, кожная кропелька радасцю засвяцілася — як і не было тых неадольных для чалавека каменных сцен.

Глянуў Алесь уперад — там дарога, па дарозе воз едзе, на возе сена, на сене дзядзька ў світцы і ў лапцях лазовых. Каня паганяе, а конь і вухам не вядзе, хвастом не ўзмахне, ляніва ідзе, ногі ледзь перастаўляе, як бы ведае: куды спяшацца — усё адно сюды, а потым назад вяртацца. Але не ў гэтым цуд, а ў тым, што конь крок ступне — хамлак сена далоў валіцца.

Пытае Алесь у дзядзькі, чаму так.

— А я, брат, і сам не ведаю,— адказвае дзядзька.— А ты куды выправіўся?

Расказаў Алесь сваё гора (а то як жа! Раз у далёкі свет шукаць праўду рушыў — людзей пытай, першаму сустрэчнаму душу выкладай, не таіся!).

— Вось бы знайсці тых старцаў, што Іллю Мурамцу сілы далі, розуму прыбавілі!

— Будзеш шукаць — знойдзеш! — запэўніў чалавек.— Там даведайся, калі ў мяне сена з воза перастане скідвацца. Пакуль дадому конь давалачэ, і травінкі не застаецца. А я табе скажу, каго шукаць трэба — Перуна!

— А дзе ж яго жыллё?

— Не ведаю, брат. Пойдзеш, людзей не мінаючы,— пакажуць.

...Ідзе Алесь далей. Поле ды балота мінае, куст лазовы, гушчар яловы... Сонейка яму шлях асвятляе, хмурынка набяжыць — ад спякоты прыхавае.

Раптам бачыць Алесь — сярод поля чалавек стаіць. У фраку, на нагах чаравікі бліскучыя. І пугай шчоўкае. Узмахне пугаўём і — шчоўк. Узмахне — шчоўк.

— Што робіш? — прывітаўшыся, пытаецца Алесь.

— Хачу, каб ніва ўзаралася,— адказвае чалавек.

— Пугай жа поле не аруць?!

— Э, брат, сам ведаю. Але вось стаю ўжо каторы год і не магу адысціся. Работа ў мяне такая. Надакучыла... А ты куды?

Расказаў Алесь сваю бяду.

— То ж даведайся ў свеце, дакуль мне тут сохнуць. Але на зямлі ты не знойдзеш адказу...

Хто праўды шукаць выправіўся, таму і карты добрай варажбіткі далёкую дарогу пакажуць. А ў дарозе не ў парозе — усялякіх дзівосаў — хоць у мех складай. Колькі там яшчэ вёрст адмераў — бачыць: чалавек на малых сварыцца, патрабуе, каб не займаліся пустой работай. А тыя з берага кідаюць камяні ў раку... На свайго ж апекуна нават не глядзяць.

— Што за ліха ў цябе? — пытаецца Алесь.

— Ды вось хачу, каб ішлі буракі палоць, сена сушыць, а яны ад ракі ні кроку. Знайшлі занятак: камянём у ваду — боўць, а потым бурбалкі лічаць. І ў нататнік запісваюць. А ты куды?

Расказаў Алесь пра сябе.

Многа яшчэ дзівосаў — і пешых і на калёсах — бачыў у дарозе Алесь. Ды хіба ўсе пералічыш?

Доўга ці коратка ішоў, прыйшоў да цёмнага лесу. А там на ўзлеску хатка на чатырох камянях. У хатцы той знахарка чэрствы хлеб жавала, свой век дажывала.

Адчыніў Алесь дзверы, парог пераступіў, а яна (на тое і знахарка!) кажа:

— Заходзь, сын Гаўрылы, даўно чакаю і клопат твой ведаю. Дапамагу, калі ты — і сам магу. Сядай на лаву, слухай пра сваю справу.



І знахарка расказала Алесю пра тое, як перамаглі добрыя асілкі Змея Гарынавіча, спалілі, а попел па белым свеце развеялі-распылілі. Ды ў трыдзявятым царстве-гасударстве паміж дубам і ясенем лапік скуры яго паганай застаўся. Вось і ўзрадзіўся дармаед. Павуцінне сплёў. Ад яго цяпер усё зло па зямлі шлындае. І брат Алеся — Глеб — у яго на пабягушках.

— Здолееш прайсці да замка Змея — будзеш пераможцам. Не адзін добры маладзец спрабаваў, ды з чым выходзіў, з тым і вяртаўся — ім жа лепш загінуць было, чым такі сорам. Дарогу ж да палаца ведаюць толькі людзі адной вёскі. Але ў іх вечны разлад паміж сабой, адзін аднаму ў вочы не глядзяць. Хто зможа іх прымірыць, таму і пакажуць, дзе Змеяў палац.

Дзень і ноч — суткі проч, і апынуўся Алесь у той вёсцы, пра якую знахарка расказвала. Людзі ў ёй панурыя ўсе, нібы толькі што старасту пахавалі. Толькі Алеся заўважылі — да яго кінуліся: у пасцілцы перад сабою нясуць штосьці.

— Цябе сам Бог да нас прыслаў. Знайшлі мы чужое шчасце — на ўсіх яго не хапае, а аднаму аддаць — ворагам астатнім будзе. Вось і носімся, як курыца з яйкам, днямі над ім прападаем, а поле неаранае стаіць, пожні някошаныя, печы халодныя. Ты ж чалавек прышлы, бяры яго сабе, збаў сяло ад навалы.

Глянуў Алесь на чужое шчасце, а яно такое, што ні пяром апісаць, ні ў казцы расказаць. Хіба толькі ўбачыць хоць разок. І не можа Алесь ад яго вачэй адвесці — прываражыла хлопца, шэпча яму салодкім голасам:

— Кінь ты свае клопаты дробныя-непатрэбныя. Бяры мяне, будзеш маім гаспадаром. А я ўсё зраблю, чаго толькі твая душа не зажадае.

І вяскоўцы яго ўгаворваюць:

— Бяры, хлопча, яно ж нічыё. Вось жыццём нацешышся!

І ўзяў бы Алесь, як бралі ўсе добрыя малойцы, што да Змея дабіраліся. Узяў бы, каб не быў у жыце хрышчоны, у лузе спавяданы, хлебам гадаваны, працай навучаны. У яго ж рукі ад зямлі чыстыя, душа ад неба светлая — а такім чужое шчасце вачэй не мазоліць.

Але як людзям дапамагчы, каб чужое шчасце і ім вачэй не мазоліла?!

Узяў Алесь каня, прывязаў да яго чужое шчасце, гікнуў — і памчаў конь у свет: там, пэўна, і знойдзецца той чалавек, які згубіў яго.

І адразу ў вёсцы нібы яшчэ адно сонца ўзышло! Не стаяла больш чужое шчасце папярок горла нікому і не хавалі цяпер людзі вачэй адзін ад другога, не таілі зайздрасць і злосць.

Сяляне паказалі Алесю, дзе замак Змея Гарынавіча. Гэта ён падкінуў чужое шчасце, каб разлад быў, а ў адзіночку ніхто з усёй вёскі дарогі да палаца не мог знайсці. Маглі яе знайсці толькі разам.

Ступіў Алесь на ганак палаца і толькі падумаў: «Як жа мне такое страшылішча перамагчы?!» — а палац сам сабою і рухнуў, нібы скрозь зямлю праваліўся. На яго месцы трошкі пыл паклубіўся, а потым убачыў Алесь перад сабою луг квятністы, а на ім сам Змей Гарынавіч ляжыць, ледзь дыхае. Вочы яго ўжо чорны свет не бачаць.

А быў той палац ліхам крыты, жорсткасцю збіты, падмуркам яму была хлусня, хітрыкі — дзвярыма, вокны на плётках віселі, сцены з нагавораў складзены, печы — з ленасці. І не мог ён устаяць хвіліны перад праўдзівым і сумленным чалавекам. Уся ж сіла Змея Гарынавіча была ў яго палацы. Палац рухнуў — і стаў Змей пакорны, нібы тая авечка.

Агледзеўся Алесь — а побач з ім і брат яго, Глеб, той, што застаўся ў Полацку есці дармовы хлеб. Абшарпаны стаіць, нібы толькі што з жабрацкай дарогі.

Скруцілі браты Змея, у мяшок укінулі і назад у дарогу рушылі. Да знахаркі зайшлі. А яна і кажа Алесю:

— Ёсць каля вашага дома крыніца з жывою вадзіцай, набяры ў ёй вады, памачы бацьку рукі, вочы прамый — ён і стане відушчы, чуць будзе.

— Ён жа не сляпы і не глухі,— запярэчыў Алесь.

— Вочы яго бачаць, але не ўсё разумеюць. Вушы чуюць, ды не тое, што трэба. А цяпер спяшайцеся, калі бацьку жывога бачыць хочаце.

Памчалі браты што духу ёсць да бацькавай хаты. Па дарозе тых дзівакоў сустрэлі.

Аднаму Алесь сказаў:

— Абвясці ты сваім малянятам, што з сённяшняга дня ў іх такая работа будзе — кідаць у раку камяні і бурбалкі лічыць, яны і разбягуцца адсюль.

Другому сказаў:

— Вось табе конь Змея Гарынавіча. Ты ж скідай фрак і чаравікі бліскучыя, абувай боты рыпучыя, каня пугай сцябай, на плуг налягай — вось і ўзарэцца тваё поле!

Трэцяму сказаў:

— Не ў той бок сена вязеш, таму і звальваецца.

Тым часам, пакуль сыны былі ў свеце, Гаўрыла дошак нагабляваў, труну зрабіў. З разладу і гора паміраць сабраўся — рукі злажыў і ляжыць, чакае старую з касой.

Ды ў добры час Алесь з Глебам вярнуліся. Бацьку рукі, вочы жывой вадой абмылі, той і аджыў. Парадаваўся вяртанню сыноў і моцна заснуў, бо ўжо вечар быў.

Браты ж тым часам зацягнулі мяшок са Змеем Гарынавічам на вясковую кузню і прыладзілі яго агонь раздзімаць — вось адкуль горан у кузні.

А Гаўрылу назаўтра ні свет ні зара певень разбудзіў:

Кукарэку, кукарэку!
Уставай, Гаўрыла, ідзі за раку.
Там лён спее, жыта таўсцее —
не дастанецца лайдаку.

Дзівіцца Гаўрыла, што даўно не чуў, пра што певень па раніцах спявае. Усхапіўся з ложка, сыноў разбудзіў, і заспяшаліся яны гаспадарку спраўляць.

А певень ужо другі раз спявае, падганяе Гаўрылу:

Кукарэку, кукарэку —
у каровы малако на языку...

Пагнаў Гаўрыла карову ў поле, прыгледзеўся — у яе пыса ўніз скіравана, вочы на зямлі шукаюць, значыць, і корм яе пад нагамі, а не над рагамі.

Так і стаў Гаўрыла зноў разумець мову прыроды — адчараваў-такі Алесь чары Змеевы.

З той пары ў Гаўрылы павялася ўзноў гаспадарка, і не была больш карова казой, а сякера — касой.

І сарока цяпер маўчыць. Хіба толькі пра Ніла ўспомніць і тады трашчыць:

— Пакуль Ніл усю навуку вывучаў, столькі папер спісаў, што не можа ў іх разабрацца. І цяпер з шафы ў шафу пераносіць, перакладае, пылам перасыпае, усё шукае, у якой запісаў, як бацькаву гаспадарку расчараваць.

Вось вам і казка, а мне лазы вязка.



# Замова на замову

У прыпарны час, калі ля печы бражыцца квас, паўднёвы вецер за лес зіму зносіць, а зямля семя просіць, паклікаў бацька сыноў і загадаў ім поле пераараць і засеяць.

Прыйшлі браты на стайню.

Саўка крутануўся, павярнуўся, падняў — паднёс — скінуў, па двары сюды-туды прайшоў — і воз гатоў: і конь у калёсы ўпрэжаны, і восі дзёгцем змазаны. На калёсах — і плуг, і барана, і мяшок ячменю.

А Зміцер тым часам лесвіцу паставіў, прыступкі памацаў, залез пад страху, з-за латы пугу дастаў (там яе ў мінулую восень прыхаваў). Разгледзеў — праверыў, ці не злежалася за зіму скура, ці не зацвярдзела, а то моль пераела, можа. Раз-другі ёй у паветры свіснуў-шчоўкнуў і задаволены кажа:

— До-о-брая пуга! На тое і збярог, каб званчэй шчоўкала, ямчэй да спіны прылягала, лішняй перадыхі не давала. Не цяпер спаць у шапку або ў бот, веснавы ж дзень корміць год!

Як усё справілі, селі браты ў воз і едуць. Зміцер лейцы тузокае, спрытна пугай нахлёствае — каня паганяе:

— Но, кося, но! Табе з вечара аўса далі, каб не быў на хамут палахлівы і што духу ёсць вёз двух малайцоў да нівы. Мы ж зробім усё чыста-гладка, як бацька наказваў — і поле ўзаром, і ячмень пасеем. Нарасце яго коп... і не злічыць. Завязём на кірмаш, грошай набяромся... От і багатыя будзем! Бацька мне гадзіннік купіць з-за трыдзевяць зямель прывезены, а табе, Саўка, лазы дасць, новыя лапці сабе спляцеш.

Так і едуць. Мінаюць адну горку, трэцюю лагчынку, раку перабрылі, а там і поле бачна.

Тут Зміцер штурхнуў локцем брата і шэпча:

— Замову я адну ведаю. Калі яе аднаму гаварыць, другому тым часам гуляецца, а не працуецца, і час хутка бяжыць, і стомы не чуецца.

— Як гэта?! — дзівіцца Саўка.— Так не бывае.

— Яшчэ як бывае! Вось прыедзем у поле, пабачыш.

Прыехалі браты ў поле.

Саўка адразу за плуг і ну працаваць. А Зміцер на ўзмежку прыстроіўся, глядзіць так пільна на брата і замову сваю кажа:

— Савачка, Сава, табе за шчырую працу гонар і слава. Ты ў нас майстра на розныя штукі, людзі ведаюць, якія ў цябе працавітыя рукі.

Кажа так Зміцер і кажа, а Саўка тым часам на плуг налягае. У Зміцера ж язык, вядома, без касцей. Словы адно да другога самі сабой складаюцца, ды такія прыемныя, сам бы заслухаўся, каб хто так казаць мог.

— Сава, Саўка, цябе і конь слухае, не шчыкне і траўкі — знай, плуг цягне, працуе, стомы, як і ты, не чуе.

І цяплей ад замовы нават самому Зміцеру пад грудзьмі робіцца. Думае ён: «Вось як Саўку добра! Лацно, калі замова з хвалебнага слова».

Пытаецца ў Саўкі ён:

— Ну, ці дапамагае?

А таму што: адпачыўшы, здаровы, ды яшчэ смешнавата з брата. Адказвае:

— Хто яе ведае... Працуецца ж добра. Мо і сапраўды дапамагае.

Узараў Саўка палавіну поля і кліча Зміцера:

— Цяпер твая чарга за плугам ісці.

— Што ты, Саўка, а хто ж замову казаць будзе! — здзівіўся той.

Бачыць Саўка, прыйдзецца яму і за Зміцера працаваць. І разумее, што брат хітрыкі строіць, але спрачацца не стаў, зноў на плуг налёг. Толькі падумаў: «Змітракова замова не нова; мне ад таго не свеціць,

не грэе, што ён на пана хварэе. Хай сабе на разе і так, але ж што рабіць будзе бядняк, бо ні сядзе ж, ні ляжа, калі бацька сваю замову скажа».

Тым часам сонца ў небе якраз так стала, калі абедаць пара. Селі браты есці. Саўка як спрытна працуе, так хутка і есць. А са Зміцерам штосьці незразумелае дзеецца: чым больш есць, тым больш хочацца. Усё, што маці на абед настроіла, паеў, падчысціў, нават крошкі хлебныя сабраў і ў рот кінуў. А быццам і макавага зярнятка з раніцы ў роце не меў. І ўсё просіць:

— Сава, братка, родная крывіначка, аддай мне і тваю скарыначку.

Калі ж усё было з’едзена і выпіта, Зміцер да ўзмежка паплёўся, а Саўка, вядома, заспяшаўся ячмень сеяць. Яму добра працуецца: вэнджаніна не суп, хай сабе і з добрых круп, перагнешся на пуп — выльецца. А Зміцер на ўзмежку круціцца, верціцца, як кот ля дзяжы з каўбасамі. А ў жываце пуста, толькі неяк цёпла і млосна. Паспрабуй тую замову казаць на галодны жывот! Збівацца стаў, словы як са смалы цягне:

— Савачка, Сава, ты і за бараной ідзеш як пава... Цікава, а ці ядомая пава?.. — А тады раптам як зацягне: — Сава, Саўка, калі ж будзе ўпраўка, ужо і над полем шэра, а дома стыне вячэра!

Сяк-так змучыў дзень.

А Саўка ячмень пасеяў. Знямогся ён ад працы, але ногі яго радасць перастаўляе — вялікую работу-заботу з рук і галавы збыў.

Ужо сонца за лесам схавалася, калі ў панадворак уехалі. Саўка стаў каня распрагаць, а Зміцер бягом у хату ды за стол. Хапаецца, есць, аж за вушамі храбусціць, а насыціцца не можа. Спалохаўся ён тут не на жарт, плача і бацьку скардзіцца, просіць:





— Можа, знахара пазаві, хвор незразумелая на мяне напала.

Паглядзеў бацька на яго ўважліва і пытаецца:

— Што рабіў ты ў полі?

— Саўку дапам-а-гаў...

— А як?

— Замову казаў,— ікаючы ад слёз, адказвае Зміцер.

Падумаў, падумаў бацька і зноў пытаецца:

— А ў грудзях было цёпла?

— Было і цёпла, і прыемна спачатку, а цяпер аж пячэ і млосна.

Тады паслаў бацька Саўку на стайню па пугу, а Зміцеру кажа:

— Кладзіся на лаву, агаляй спіну і ніжэй. Тут без замовы на замову не абысціся.

Узяў бацька пугу і давай са Зміцера тую хваробу выганяць дзедавым спосабам, каб сын з пустога жывата не памёр. Узмахне пугай і прыгаворвае:

— Дзедава замова на ўнукаву хваробу. Як дзень, так тут ёсць лень, як лень — пусты дзень. Праз пугу-падпругу на калоду-пень выпаўзай-выходзь з лайдака лень. Ты за пазухай сабе гняздо звіла, кроў малайца п'еш, яго хлеб ясі, Змітраку ж ні кроплі не дасі. Выходзь лень, ляці ў балота за той корч-пень, што ў заморскіх лясах, за сінім акіянам, востравам Буянам. Скаціся там з беражка крутога, разбіся аб скалу цвёрдую-жалезную.

Саўка і цяпер бажыцца, што бачыў, як штосьці рудое, падобнае на ката суседа Іллюка, шаснула маланкай у акно. То, відаць, і была Змітракова хвароба.

І ў тую ж хвіліну Зміцер як запросіцца:

— Ай, татачка, хопіць, пэўна, ужо выйшла хвароба.

Апусціў бацька пугу і пытае:

— А замову тую, што Саўку на полі казаў, мне паўторыш?
— І рад бы, ды забыўся.
— Забыўся? — перапытаў бацька.
— Забыў, татачка, гладка забыў.
Бацька ўздыхнуў і кажа:
— Значыць, дапамаглі лекі. Садзіся есці.
Сеў Зміцер за стол — бульбіну з'еў, малаком запіў, тут і сыт стаў.

## Самабраны абрус

Жыў-быў Мікіта: карыта разбіта, нячэсана воўна і ў двары работы поўна — каса не кляпана, канёк не каваны, мука не пытлявана, вяроўка парвана, ніўка не ўзарана...

Выйшаў Мікіта з хаты, глянуў наўкол — работы не адбавілася. Махнуў рукою: «Зраблю зімою». І толькі да дзвярэй павярнуўся, каб парог пераступіць ды лезці на печ даглядаць сон пра грашовы звон, аж бачыць: тры сарокі селі на ліпіну ў двары. Яны па свеце наляталіся, ад мудрых слоў вяршкоў нахапаліся.

Вось адна сарока і кажа:

— Бедны чалавек Мікіта. І тры гады не пройдзе, як не стане ў яго ні хлеба, ні шарсцінкі, ні птушкі, ні скацінкі. А не марозіў бы на печы маладзецкія плечы, каб ведаў, што за трыдзевяць зямель у караля Саса кірмаш будзе. На ім шчасця можна ўхапіць такое...

Другая сарока кажа:

— У яго і конік трывалы. Невялічкі, здаецца, марудны, але ўдалы — перавёз бы Мікіту праз агонь, ваду і медную гару.

Трэцяя кажа:



— Толькі даедзе Мікіта да караля Саса, калі ехаць будзе хутка, але не спяшацца.

Мікіта падумаў: «А чаму б мне, малайцу, і не паехаць на той кірмаш!»

Пабег ён канька запрагаць. Аж бачыць — ідзе капа сена, пад ёй — дзядзька Сева. Тут жа з мяхом надышоў і Пахом. Кажуць яны Мікіту:

— Узяў бы ты, Мікіта, збіў карыта, касу пакляпаў, вяроўку звязаў, коніка падкаваў, муку спытляваў, ніўку ўзараў, воўну счасаў — глядзіш, чалавекам бы і дома стаў!

— Не,— адказвае Мікіта,— дома, вядома, салома ядома. А вось у Саса каралеўскія піва, хлеб і мяса.

Сказаў так Мікіта, лейцы тузануў, канька пугай сцебануў і паехаў па абрус-самабор.

Ехаў Мікіта, ехаў і раптам у цёмным лесе нібы на сонца ўз'ехаў. Разгубіўся. Лейцы тузае, каню пашчэнкі цуглямі рве, а ўсё без толку. Куды не паткнецца, як не павернецца — кругом агонь гарыць, ламачча трашчыць, полымя аж да неба шугае, каго б спаліць шукае.

Выпусціў тут Мікіта лейцы з рук, пугу кінуў. Сам у вазку прытаіўся і не дыхае.

А канёк (і адкуль спрыт браўся!) як адчуў волю, хоць і ў хамуце — цераз пень-калоду, праз полымя — у воду... Дзе агонь аб'едзе, дзе абскача... Вось табе і кляча! Вывез Мікіту туды, дзе жыць можна.

Выпраміўся тут Мікіта, лейцы ў рукі і гогалем сядзіць у вазку. Пугай махае, канька паганяе-пакрыквае:

— Но, воўчае мяса, стралой імчы ў каралеўства Саса!

Ідзе канёк, а за ім вазок, калі збоку глянуць — спорна коціцца. Раптам бачыць Мікіта: навокал вада знізу зялёная, зверху рудая — якраз такая, як у тым балоце, што чалавеку заўсёды радуецца.

Спужаўся Мікіта і лейцы з рук выпусціў.

Канёк жа яго, хоць і ў хамуце, ды волю адчуўшы, дзе ўплаў, дзе брод натрапіць, праз хмыз на купу, з цяжкасцю, але вазок коціць і коціць. Так і вырваў яго з балота. У вазку — Мікіта. І ў руцэ яго ўсё тая пуга, што дротам перавіта. Распраміўся ён — дзяцюк мажны, сядзіць важна і канька паганяе:

— Го-о-о, ледзь паўзеш, спіш ці чалавека вязеш?! Калі не знайду самабранку — скручу ў абаранку!

Раптам бачыць: перад ім гара медная. Гладкая, нібы люстэрка, і крутая.

У канька хамут з шыяй зросся. Хоць і не каваны, а цягне ўгару вазок. Мікіта сцішыўся, прытаіўся, рукамі ў дошкі ўчапіўся, аж пазногці ў пальцы ўехалі. І думаць баіцца: «Ведаў бы конь аб сваёй сіле — разок крутануўся, і быць мне ў магіле».

А канёк вывез Мікіту ў роўнае поле. Удалечыні горад караля Саса паказаўся. Па дарозе ж з усяго свету туды малайцы на хутканогіх конях імчаць, Мікіту абганяюць, пылам вочы яму засыпаюць.

А тут адкуль ні вазьміся тры сарокі ляцяць побач з вазком і сакочуць:

— Каб Мікіта паспяшаўся, на кірмашы яму б добры куш дастаўся.

— А-а, з такой клячай быць яму ўвесь век з нястачай.

— Каб падагнаць сумеў — якраз бы падаспеў!

Сказалі так сарокі і паляцелі далей з толку збіваць людзей.

Усхапіўся тут Мікіта, сячэ канька пугай так, аж рубцы крывавыя на спіне яго ўздуліся.

Трывае канёк, цягне вазок.

Тады Мікіта на зямлю саскочыў, важкі кол ухапіў...

Першы раз ударыў — здрыгануўся канёк.

Другі раз ударыў — аж прысеў канёк.

Трэці раз ударыў — на дыбы ўзвіўся канёк. Віхрам крутануўся, парваў гужы, супоню, азадкам вазок у трэскі разнёс. Сам жа ў лес да ваўкоў збег.

І як толькі Мікіта жыў застаўся?!

Сабраў ён усё, што ад вазка засталося, хамут парваны сабе на шыю надзеў і павярнуў да сваёй вёскі. Назад, хоць і горка, але ісці лёгка. І дзе толькі агонь, вада ды медная гара падзеліся — як скрозь зямлю праваліліся!

Калі ж Мікіта да дома падыходзіў, Пахом штосьці кляпаў абухом, дзядзька Сева ячмень сеяў. І здзівіўся толькі дзед Мітроша — што гэта ў Мікіты за незвычайная ноша?!

Ну, а тут сарокі прыляцелі, на ліпіну селі. Вось адна сарока і кажа:

— Дзіўны чалавек Мікіта. Сядзеў бы дома — дома, усім вядома, салома ядома.

— Вось-вось. А так прыцягнуўся з-пад каралеўства Саса, не бачыўшы год ні хлеба, ні мяса,— сказала другая.

— Трыццаць тры гады Мікіта пражыў, а розуму не нажыў. Быццам не ведае, што не бывае на свеце, каб віламі не махаць, на пуп не падымаць, а толькі есці каравай, спаць, гуляць, пальцам ківаць ды на дзевак паглядаць.

Пужнуў Мікіта сарок каменем, сам жа ў двор пайшоў, збіў карыта, касу пакляпаў, вяроўку звязаў, муку спытляваў, воўну счасаў... «Бач ты, Мікіта і дома чалавекам стаў!» — везучы сена, здзівіўся дзядзька Сева. Пахваліў яго і дзед Мітроша: «Мікіта цяперака ў нас харошы!» Пажадаў Мікіту Пахом: «У хату шчасце нясі мяхом». А як там праходзіў Якаў — той ад радасці ледзь не плакаў. І ўсе яны ведалі, што прыйдзе Мікіта ўвечары дамоў, засцеле на стол абрус, паставіць на яго соль, хлеб, а там і яшчэ штосьці знойдзецца. Потым сядзе за яго Мікіта і падумае: «А што, чым мой абрус не самабор?!»



# Казка-быль, як будаваў хатку Базыль

Перапёлка гняздо віла, янот нару рыў, мядзведзь бярлог ладзіў. Задумаў і Базыль хатку зляпіць, каб парог пераступіць, а за ім — печ. У печы ж агонь трашчыць, на патэльні скварка пішчыць, у чыгунку юшка кіпіць. А за каптуром дзеткі тым часам загадку разгадваюць: што такое — каля носа смачнае ўецца, а ў руку не даецца?! Ну, і яшчэ ў той хатцы, у панадворку і каля двара ўсялякага дабра: у садзе пчолы, ля печы чапёлы, на гарышчы каўбасы, у халадку дзяжа з моцным квасам, у хляве рагуля, пад акном дулі, у пячурцы ступа, у ступе таўкач, на крукy брыль... Вось тут суседзі і скажуць: добры гаспадар Базыль!

Задумаў так Базыль, пайшоў у поле, знайшоў па сіле камень, падналёг на яго і пакаціў. Коціць сабе і коціць, пот з ілба выцірае, песеньку пад вус напявае: «А мне свая хатка, як родная матка, у сцюжу сагрэе, у голад накорміць...»

А тут насустрач ідзе Клім. Кажа Базылю:

— Кі-і-нь! Навошта табе свая хатка? За сухім балотам, за вытаптанай пожняй, на Лысай гары, што каля Гэльчынай прорвы, сама сабою расце нічыя. І не хатка, а дом! На высокім пагорку, на сярэбраным падмурку. Хай сабе і не яловы, але ж будзе новы, гатовы. Сядзь там на пень дубовы і чакай. Як толькі вырасце, тут і кідайся ў дзверы — твой будзе!

Перабег Базыль сухое балота, пералез Гэльчыну прорву, ускараскаўся на Лысую гару... Аж бачыць, і праўда, расце сам сабою дом, ды не па днях, а па гадзінах... Не на пнях, а на лаўжынах... На высокім пагорку, на сярэбраным падмурку.

Вярнуўся Базыль хуценька да каменя, і толькі за яго ўзяўся, каб закаціць туды, дзе браў, аж тут адкуль ні вазьміся падышоў дзед Ягор. Убачыў Базыля, узрадаваўся:

— От, малайчына! Люблю, калі маладыя ды ўдалыя хатку сваю будуюць. Ну, брат, яшчэ і я магу, давай памагу!

Прыкацілі яны камень на бераг ракі. Агледзеўся дзед Ягор навокал і кажа:

— Лепшага месца для хаткі і не знойдзеш. Справа табе ракі і рыбы, злева ягады і грыбы, проста перад табою хлеб і малако, а над самай галавой — о, святло і цяпло! Тут, брат, і з дзеткамі не прападзеш.

Адмерыў дзед Ягор дзесяць крокаў на поўдзень, дванаццаць на захад, прыжмурыў правае вока, левым стральнуў з каменя праз тэлеграфны слуп на бярозу, нагою тупнуў і рашыў:

— Вось тут і капай яму на падмурак. А мне час кароўку на кірмаш весці, бо сёлета ўдзялілі пожню, а на ёй — лапухі і пух, і то з Гаўрылам на двух.

Узяўся Базыль за рыдлёўку. Зямельку капае, пот з ілба выцірае, песеньку пад вус напявае: «А мне свая хатка, як родная матка, у сцюжу сагрэе, у голад накорміць...» Аж чуе, збоку падпявае яму хтосьці. Агляну́ўся, а побач дзядок стаіць. На ім світа пры цару Гароху шыта. На світцы лата, а ў лаце дзірка. Сам жа дзядок босы, а за плячыма торба пустая. Усміхаецца ён у бараду і кажа:

— Здароў, Базыль! Будзем разам тваю хатку будаваць.

«Сямён!» — жахнуўся Базыль. Людзі кажуць, ён ад Адама па зямлі ходзіць, ламаны грош за ручку водзіць. І калі ўжо прыстане да чалавека, то як беднасць да галыша. Ні адбіцца ад яго, ні адхрысціцца, ні ўцячы.

Кінуў Базыль сваю рыдлёўку, і дзе бокам, дзе скокам, праз Гэльчыну прорву ды на Лысую гару ўзабраўся. Сеў там на пень дубовы, нагу за нагу заклаў і рашыў: «Добра свая хатка, але новая, гатовая — лепш».

Сядзіць так Базыль, галавой круціць, разглядае, як гэта сам сабою дом расце.

І сапраўды ж дзіўна! Бэлькі не чэшуцца, дошкі не габлююцца, гліна не месіцца, клямка не куецца, цвікі не забіваюцца, а дом расце-выганяецца.

Колькі часу Базыль сядзеў-туліўся на тым пні дубовым, падлічыць можна, ды не варта. Нарэшце вымахаў гмах аж пад неба. Базыль тут жа ў дзверы кінуўся, у парозе абярнуўся і стаіць, чакае, што ж цяперака суседзі казаць будуць.

Ішлі там якраз Грышка і Цішка, убачылі Базыля і пытаюцца:

— А чые ж у гэтым двары порхаўкі выспяваюць і трава-свінуха ўзнімаецца?

— Толькі не мае! — адказаў Базыль.— Нічые яны.

— А чый жа тады гэты хлеў у двары дома, а ў хляве кароўка?

Ікнуў Базыль, кашлянуў і адказвае:

— І яны, вядома, нічые.

— А чый жа гэты сад, а ў садзе пчолы? — дапытваюцца ўсё Грышка і Цішка.

— Нічые і ўсё тут!

— А чыя ў страсе лата?

— Таксама нічыя.

— А чый на круку брыль?

— О, брыль — ён мой!

Засмяяліся Грышка і Цішка: «Ну і гаспадар Базыль, дабра толькі і мае, што брыль!»

І пайшлі сваёй дарогай.

Ды бяда не ў гэтым, а ў іншым. Пчолы, як пачулі, што яны нічые, тут жа роем сыпанулі з вулля і зляцелі ў глухі лес у цёмнае дупло. Кароўка, як даведалася пра тое ж, здзівілася вельмі, жаласна зарыкала і збегла шукаць свайго гаспадара. Нічый агонь у нічыёй печы аж счарнеў ад гора і абярнуўся галавешкамі. А нічыя лата ў нічыёй страсе, дык тая ад нуды пазелянела і на вачах згніла.

Як на грэх, ляцела там паблізу варона, села адпачыць на страху... Ну, пад ёй і паламалася лата. Паламалася лата — развалілася хата. Застаўся ад яе толькі высокі пагорак, гліняны падмурак, побач пустыя хлеў ды вуллі, а над усім гэтым дулі.

Стаіць Базыль на Лысай гары, патыліцу чухае, у пальцы дзьмухае, адным вухам слухае, што ж цяпер будзе казаць Клім. А той сваё гне:

— Ты па дробязях бедаваць кінь! Вунь, за Мышынай нарой за Сабачай гарой, не даходзячы да сёння, пяройдзеш заўтра, а там, якраз насупраць паслязаўтра расце сам сабою...

Не даслухаў Базыль на гэты раз Кліма і падаўся да родных мясцін на бераг ракі. А па дарозе надумаўся, як яму ад Сямёна збавіцца.

— Калі я тваю торбу напоўню пад завязку, пойдзеш ад мяне? — спытаў ён у дзядка.

— Чаму не пайду, калі пад завязку,— усміхнуўся той у бараду.

Развязаў Сямён торбу, а Базыль стаў напаўняць яе.

— Вось табе каравай.

— Яшчэ давай!

— Шмат сала.

— Вядома ж, мала.

— Барана...

— Завязваць торбу рана,— пасміхаецца Сямён.

Праглынула Сямёнава торба яшчэ і курку, і пеўніка, і нават цешчыну цялушку. А як была пустая, так і засталася. Вось тут і зразумеў Базыль, што дагэтуль былі прыказка ды казка, а самая быль яшчэ наперадзе. Бо памочнік з Сямёна вядомы: то пілою па суку, то сякерай па цвіку, а то пад нагамі блытаецца. Ды не проста так: праз яго Базыль то штаны падзярэ, то бот на вастрыё ўзгоніць.

Словам, працуе Базыль за сябе і за Сямёна. А есці сядуць — усё наадварот. Сямён сала з'есць за сябе і за Базыля. Бедалага ж поліўкі пасёрбае, вадзіцай зап'е — і за работу.

Аднойчы нёс Базыль на плячы цяжкае бервяно. Сямён жа збоку тупаў, па баках глядзеў, сваё бачыў і прыгаворваў, як звычайна:

— Так яно, хлопча, так... І не проста так, а за добры пятак, багатаму ўсё адно і чорт дзяцей калыша. А табе за так вунь... штраф ужо ў паперы піша. І ніхто не паможа, бо бедавальнікаў ва ўсе часы многа, а ратавальнікаў штосьці не чуваць.

— Зжыву я цябе! — узлаваўся Базыль.

— Як? — навастрыў вушы Сямён.

— Работай зжыву. Песенькай сваёй.

І заспяваў Базыль, як застагнаў: «А мне свая хатка, як родная матка...»

— Э, хлопча,— перабіў Сямён.— Такое мы ўжо чулі.

— Пачуеш і іншае,— скрыпнуў зубамі Базыль.

— Дзе ж сілёнкі знойдзеш так працаваць, каб было чым маю торбу напоўніць? — хіхікае Сямён.

— Знайду.

— Адны абяцанні ды пагрозы, а торба як была пустая, так і застанецца!

І праўду Сямён казаў. Дзе ж бедняку, поліўкі пасёрбаўшы, сілы сабраць?!

На шчасце, ішоў паблізу дзед Ягор. Паслухаў, як Базыль з Сямёнам спрачаюцца, і кажа:

— Словы твае, Базыль, і сапраўды пустыя. А таму і сілы не маюць. А слова, можа, усяго адно і трэба знайсці на твой час патрэбнае.

— І якое ж гэта слова?

Падумаў дзед Ягор крыху і пытае:

— Дзед табе ў спадчыну ці пакідаў што?

— Пакідаў,— буркнуў Базыль.— Скрынку... З казюркамі.

— От яна табе і патрэбная!



Прыйшлі яны да ўдзірванелага саду. У садзе трухлявая паветка, у паветцы скрынка. Адкінуў Базыль вечка, а з павуціны нешта скок на падлогу. Само вёрткае, круглае, пругкае... Закруцілася ваўчком і тут жа да дзвярэй падалося.

Ды самы цуд не ў гэтым, а ў тым, што тое нешта яшчэ і песеньку спявае. Праўда, такім ужо рыпучым голасам, што Базыль і слоў не зразумеў.

А дзед Ягор зразумеў:

— Вось яно, дзедава слова, табе і дапаможа. Толькі пакуль не вярнуся, трымай яго і не выпускай адсюль.

Сказаў так дзед Ягор і знік.



А Базыль... Дзе ж там маладому дзедава слова ўтрымаць? Яно і рвецца за парог. І Базылю цікава, як гэта слова паможа хатку будаваць. Ды і Сямён збоку падбухторвае: «Давай яго пусцім. Я ж табе дабра жадаю. Можа, і сапраўды ад мяне збавішся. Мне што, прытулак сабе ўсюды знайду. Такіх, як ты, на свеце больш, чым зорак на небе».

Так і не ўтрымаў Базыль дзедава слова. Дзверы адчыніў, а таму толькі таго і трэба. Праз парог перакулілася і пайшло калясіць па сяле, сваю песеньку спяваючы.

Толькі вось бяда, ніхто песні не можа зразумець.

— Эх, маладзён, усё сапсаваў,— уздыхнуў дзед Ягор, калі ўбачыў гэта.— Слова не верабей... Ну, ды раз узяўся давесці цябе да толку, паспрабую.

Нікому яшчэ не ўдавалася злавіць выпушчанае слова. А дзед Ягор змог! Праўда, ніхто таго не бачыў. Як ніхто не бачыў, чым ён слову голас даў. Але ўжо пад самы вечар людзі пачулі, як спявала яно звонкім голасам песеньку:

Не звон заве на свята,
Талака, талака.
Грамадой збудуем хату,
Талака, талака.
Не церам багацею,
А сялянскі дом,
Каб жыў у ім адзіным
Базыль гаспадаром.
Талака-талака,
Бервяно валакла,
Пiлiла, часала,
Подруб укладала.

Вядома ж, такую песеньку пачулі людзі і ў Забалоцці, і ў Плейках, і ў Чарапах... Ну, а што было далей, не цяжка здагадацца.

Назаўтра, з самай раніцы
Апанас прынёс ватэрпас,
Апцівох прывёз мох,
Кузьма і Фэлька часалі бэлькі,
Тры Фамы і чатыры Яўмены выганялі сцены,
Лявон завіхаўся ля вакон,
Цімошка габляваў дошкі,
Два Ігнаты набівалі латы,
Васіль гліну мясіў, цэглу насіў,
Ніл і Ільюша рабілі печ, а ў ёй люшку,
Улас выпілоўваў на гарышча лаз,
Емяльянка каваў клямку.

А дзед Ягор паспяваў вастрыць то пілу, то сякеру.
Словам, там кожны браў шчыра на пуп,
а больш за ўсіх стараўся Якуб.



Хутка казка расказваецца, ды яшчэ хутчэй талакою хатка будуецца. Пакуль пастухі каровак з поля прыгналі, стаяў на беразе ракі Базылёў дом. А тут напаследак яшчэ прыбег Клім, забіў пад масніцу клін і даў загад усім садзіцца за сталы дашчаныя, паднімаць кубкі з сырадоем за здароўе Базыля, яго жонкі і дзетак.

А Сямён? А ён што... Як убачыў гэтулькі памочнікаў, тут жа прэч зазбіраўся. Торбу сваю на плячо ўскінуў і... ледзь павалок яе. А вось чым яна так напоўнілася, я і сам не ведаю. Не сплю, не абедаю, усё торбу развязваю, гляджу, разглядваю, гадаю-разгадваю...

# Яська-касец

*Казка-жарт*

Як толькі апошняя зорачка схавалася ад ранішняга сонца, а першы акунь плюхнуў у рацэ, тут певень і заспяваў: «Ясю, ку-ка-рэ-ку, бяры брусок у руку, на плячо касу ладкуй ды ідзі на луку…»

Прачнуўся Ясь, коўдру набок, у двор выбег, касу на плячо паклаў і на луг падаўся. Прыйшоў, залажыў касу ў траву-мураву, ды і шась... шась...

А каса ўперлася ў былінку з шаршатку таўшчынёй, узад ідзе, а ўперад — ані-ні. Не хоча касіць — і ўсё тут.

Што рабіць? Брусок жа Ясь дома забыўся.

Спаймаў ён кароўку-багоўку і адправіў яе па брусок. Сам жа толькі наладзіўся пад лазіну шуснуць, каб хвілінку адпачыць, вока прыкрыць, а тут і багоўка вярнулася. Вось Ясь і кажа:

— Браток-брусок, залацісты пясок, патрапі касу па сярэдзіне, па пятцы і па насу.

Ну і найшоў тут камень на касу! Узад-уперад, узад-уперад па ёй бегае ды прыгаворвае: «Жых-жах, жых-жах, вастрысь каса, пакуль раса, пакуль раса — касіць краса». Уф, патрапаў!

Узмахнуў Ясь касою раз-другі — хораша косіць, сама травы просіць. І аглянуцца не паспеў, як пракос прайшоў. А на другім уперлася каса ў былінку з іголку таўшчынёй і ні з месца.

Кароўка-багоўка крыльцы расправіла, і тут жа малаток і бабку прынесла.

Ясь і кажа:

— Браток-малаток, жалезны твой бок! Дзе ты цюкнеш, там толк. Пабі ж, пакляпай касу па сярэдзіне, па пятцы і па насу.

— Тах-тах-тах... — адазваўся малаток. Стаў ён касу біць-кляпаць, ды так цягне-вострыць джала, каб пасля яго трава не ўстала.

А Ясь тым часам пад лазіну шусь — і заснуў.

Пакляпаў малаток касу. Перастала яна ў былінку ўпірацца, касіць хоча, ды не можа — Ясь жа спіць, забаўкі сніць.

Просіць каса лазу:

— Разбудзі Яся.

— Зрэж мяне, тады разбуджу,— згадзілася лаза.

Зрэзала каса лазіну, стала тая Яся будзіць, над вухам яму свістаць:

— Свісь, свісь, Яська, прачнісь! Сонца высока, поле шырока і бацька недалёка...

Адкрыў Ясь вочы, глянуў у неба і хутчэй за касу ўхапіўся. Раз-другі махнуў, а каса ў былінку з волас таўшчынёй уперлася, і зноў касіць не хоча, аж лязом скрыгоча. Вось бяда дык бяда!

Раззлаваўся Ясь і што моцы было на касавідла налёг, стаў касою махаць, сілай траву збіваць. Аж пот з ілба ў тры ручаіны хлынуў.

А каса ж бітая была, ведала, як у спякоту ад маладога касца збавіцца. Агледзела яна вос, засунула ў іх гняздо свой доўгі нос і паскардзілася:

— Восы-меданосы, нектару вам на соты! Ясь мяне ўсю раніцу мучыць, касіць вучыць, сам жа не ўмее ды яшчэ падленьваецца. А даўно ж сказана і мне пераказана: касі каса, пакуль раса, раса далоў — каса дамоў!

Узвіліся тут восы цёмнай хмаркай і на Яся напалі.

— З-зы-зы, касіць трэба, калі мы не з-з-злы...

Ясь ад іх і рукамі адмахваўся, і травой адбіваўся, а ўсё адно з распухлым носам застаўся. Памацаў нос, напужаўся, малаток, брусок і бабку склаў у лахі, лахі пад пахі і даў драла з лукі аж на другі бок ракі. Бліжэй да дзяцей, тых, што плёскаліся ў цёплай вадзе, забыўшыся аб ядзе.

Толькі перад тым, як уцячы, Ясь так махануў касою, што калі яе з рук выпусціў, яна... сама сабою касіла.

Увечары ж, як толькі сонейка схавалася за лес, певень на сваю жэрдку залез, а восы ў гняздо зляцеліся, па сотах расселіся ды і мёду ўжо наеліся — прыйшоў Ясь па касу. Глядзіць... і вачам сваім не верыць: каса нікога не просіць — сама сабою косіць. Апошні пракос на лузе вядзе. І, вядома, не бачыць Ясь, што гэта кароўкабагоўка касой упраўляе, ды пад вус сабе напявае: «Марыць кожны Фама, каб касіла сама яго каса».



Ясь жа ўзрадаваўся такой неспадзяванцы, шапку ўверх кінуў. А шапка ж была зімовая! Замахала яна доўгімі вушамі, нібы варона крыламі і... паляцела...

А чаму б і не? Там, дзе каса сама сабою косіць, кароўка сена не просіць, а пчолы ў рэзгінях мёд носяць — зімовыя шапкі павінны лётаць!

## Адкуль вёска Пустапарожняя

*Казка-жарт*

Прачнуўся Юрачка, як заўсёды, ні свет ні зара. З ложка ўсхапіўся — і бягом у двор. Свінку пакарміў, цялушку напаіў, курам круп насыпаў, рагулю падаіў і за вароты яе выгнаў. Там ужо Макар-пастушок трубіў у ражок — збіраў каровак на мурожны лужок.

А жартаўнік Юрачка ўзяў у адну руку пусты збан, у другую — парожні, сеў пад дуб прыдарожны, ды і давай пераліваць з аднаго ў другі! Што? Ды хіба здалёк ўбачыш. Пералівае Юрачка і прыгаворвае: «Пакуль ёсць Ярыла златакрылы пералівайся, моцы набірайся, у чужыя рукі не давайся…»

Ляцеў там стралой да крамы Цімошка. Убачыў Юрачку, падбег, побач сеў і стаў свістаць-перасвістваць з пустой кішэні ў парожнюю. Колькі? Ды хіба злічыш.

Убачыў іх Пахом. Стаў, мех з плеч далоў і кажа:

— Памагай Бог!

— Казаў Бог, каб і ты памог! — адказаў Цімошка сарвігалава.

А жартаўнік Юрачка знай сабе пералівае з парожняга збана ў пусты, з пустога ў парожні





і прыгаворвае: «Расою-красою з усходу на захад, па ясным месяцы ды па сонцы, з пустога, як з цудадзейнага рога ўсяго многа. І з парожняга, як з луга мурожнага,— і травы, і мёду, і малака... Перабульквайся, пералівайся, ды не пралівайся, у чужыя рукі не давайся... Хто зразумее, а хто не, хто будзе мець, а каго міне...»

Патаптаўся Пахом, падзівіўся, рот закрыў, ды і марш-марш подбегам да сваёй роднай хаткі. Бяжыць і думае: «Бач ты, ён будзе мець, а мяне міне! Не, братка, я ж таксама не бязменам кроены і не лыкам шыты!»

Кінуў Пахом свой цяжкі мех пад пяты вугал, схапіў два мяхі — адзін пусты, другі парожні — і давай перасыпаць з аднаго ды ў другі. Перасыпае і прыгаворвае: «Перасыпайся, заадно перавявайся, на вока злое не трапляйся...»

Ехаў там на возе Ніл. На Юрачку з Цімошкам і вокам не павёў. А калі ўбачыў, што Пахом у таямнічую работу ўлёг — каня спыніў.

Прыжмурваўся, прыглядаўся, не вытрымаў і запытаўся:

— Ты што, Пахом, на Чорнай гары воўчых ягад аб'еўся ці ў Гэльчыным балоце дурман з раніцы нюхаў?!

А Пахом бы і не чуе: перасыпае з парожняга меха ў пусты і прыгаворвае: «З пустога ячменю многа, з парожняга гароху патроху. Перасыпайся, перавявайся...»

Пачухаў Ніл патыліцу, каня нукнуў і паехаў сваёй дарогай. Едзе і разважае: «Тое, што жартаўнік Юрачка пералівае, а гультай Цімошка перасвіствае — не навіна. А вось Пахом... перасыпае... нешта ў гэтым ёсць!»

Пад'ехаў Ніл да сваёй хаткі і хутчэй да жонкі па параду пабег. Расказаў пра ўсё, што бачыў, і пытае:

— А што мне рабіць?

Жонка, доўга не думаючы, за чапялу ўхапілася:

— Ах ты, ідал непаваротлівы! Зноў праварон іў. Каторы раз табе кажу — менш разважай, рот не разявай, а рабі, як людзі. Яны ўжо,

нябось, усё папералівалі, паперасвіствалі, папературэслі ды паперасыпалі, а ты яшчэ і не пачынаў. Бярыся хутчэй, перакладай! А каб ад сусудзяў не адстаць, я пераганяць буду.

Развярнуў Ніл хуценька свой парожні воз да пустога месца. Па ветры заехаў, каб зручней было, і давай перакладаць з пустога месца ды ў парожні воз. Перакладае і думае: «А і сапраўды ў Юрачкі тое нешта ўсё гусцей і цягучай было. І ў Пахома мех аж раздзімаўся ад прыбытку. Во, і ў мяне грузнее… з кожным разам».

Жонка ж Нілава ад варот заняла — і пераганяе з пустога двара ды ў парожні хлеў, спяшаецца, каб ад людзей не адстаць.

А тым часам Макар-пастушок схаваў свой ражок, бо прыгнаў ужо сытых каровак і цялушак дамоў. Аж бачыць: вёска тая, а людзі — не. Па справах жа іх пазнаюць!

— Зблудзіў, відаць, я,— уздыхнуў Макарка,— трапіў у вёску Пустапарожнюю, а мне трэба ў сваю.

І сагнаў Макарка-пастушок і Цімошкіну авечку, і Пахомаву кароўку, і Нілаву цялушку туды, куды да гэтага яшчэ ніколі не ганяў.

## Пра дровы

*Прыпавесць*

Якуб сена пад бок адскуб, канька ў аглоблі завёў, дугу заклаў, супоню зацягнуў, сам у вазок кульнуўся і лейцы тузануў: «Но, кося, но! Паедзем сёння далё-ё-ка, аж у лес бярозавы. Бо асінавыя дровы скрвірчаць, яловыя дровы трашчаць, альховыя дровы шыпяць, а вось дровы бярозавыя — гараць аж гудзяць!»

Ехаў Якуб вярсту з гакам заснежаным полем, каля дубовага пня звярнуў улева, там па жардзінцы перабраўся праз раку-канаву. Конь нагою ў алешнік ступіў і спыніўся, бо ўперадзе гара, а пад гарой чорт

сядзіць. Можа, і не зусім ён, але ўсё адно нячыстая сіла, таму што думкі ў Якуба змяніліся: «Асінавы лес высокі, яловы лес тоўсты, бярозавы лес далёкі... насяку я лепш алешніку».

Прывёз Якуб дровы ў двор, аж тут яго і жонка сустракае:

— Узноў туркі-баркі абляцеў, а прывёз дзве алешыны, каб твае лыка жалезам заліло.

— Гэта пад Воўчай гарой мяне чорт за нагу тузануў,— апраўдваецца Якуб.

— Кожны дзень ён цябе тузае,— наступае жонка.— У нядзелю табе не да дзела. Панядзелак і ёсць бяздзельнік, у аўторак паўторак, серада — на стале барада. У чацвер бярэш на павер. У пятніцу — перадсвятніца, а ўжо ў суботу не маеш ні да чаго ахвоты!

Спаліў Якуб альховыя дровы, заклаў дугу над каньком у аглаблю і паехаў у лес. Па дарозе прыгаворвае: «Паеду сёння далё-ё-ка. У бярозавы лес...»

Праехаў Якуб шмат поля, кавалак балота і яшчэ сем вёрст...

У алешніку ж, пад Воўчай гарой, як заўсёды, яго чорт пільнуе. Можа, і не зусім ён, але ўсё адно нячыстая сіла. Бо ўвесь свой век Якуб пра бярозавыя дровы марыць, а альховымі печку жарыць.





# Чарадзейная груша

За сінім лесам, з якога, як з чарадзейнага рога, усяго многа, ёсць поле, за полем тым стаяў тын, за тынам агарод, у агародзе хатка. Жылі ў ёй муж з жонкаю — людзі простыя, далікатныя, чалавеку ў вочы глядзяць ветліва, добрае слова гавораць ад сэрца. Падарожны вадзіцы папросіць напіцца — гаспадыня гляк малака падасць. Нечаканы госць у дзверы пастукае — для іх навіна не смутная: з лагоднай усмешкай сустрэнуць, у лепшы пакой завядуць. Што смачнейшае ў кладоўцы ёсць — нарэжуць, прыправяць, на стол пастаўяць. Убачаць на сцяжынцы дзіця — гаспадар у сад пакліча, яблыкамі, мёдам пачастуе. Адным словам, добрыя былі людзі. Толькі (бяда не бяда, як прыкінуць ды прымераць, уся бяда наперадзе) не мелі яны дзяцей.

Напрацуюцца муж з жонкаю за дзень, увечары сядуць на лавачцы ў двары на захад сонца паглядзець, не-не ды і забядуюць:

— Што з намі будзе, калі рукі рабіць не змогуць, ногі хадзіць перастануць?

Ды вось як хто пачуў, зжаліўся над іх горам, і адным часам ні то бацян прынёс, а можа, у капусце знайшлі, толькі з'явілася ў іх дзіця.

Рос і рос хлопчык Глеб, рос і рос і хутка вырас вялікі, моцны і здаровы.

Усё добра. Адно блага: Глеб касіць траву на лузе не хоча, сячы на дровы лазу не ўмее, капаць бульбу не можа. Бацька ячмень малоціць або тын папраўляе, дзвюх рук яму не хапае. Вось каб яшчэ дзве, сынавы, толькі Глеб таго не бачыць. А пакліча бацька, ён падыдзе, спытае:

— Што рабіць?

— Памажы.

— А як?

— Ну, цвік вось падай.

Глеб цвік падасць і стаіць, як помнік гультаю.

Надакучыць бацьку такая дапамога (як кашаль хваробе), скажа ў сэрцы: «Ідзі, сынку, адпачывай, сам зраблю».

І што яму зашкодзіла, невядома. Ці то маці на лайдака ненарокам год васямнаццаць таму глянула, а можа, прычына цяперашняя, як кажуць, гены? Ды якія ж гены? Толькі, калі што не па ім скажуць, вусны надзьме і пытае:

— Знайшлі мяне ў капусце?

— Знайшлі,— адказвае маці.

— Так, зрабіце ласку, тады мяне смачна накарміць, квасам напаіць, забавіць і развесяліць. А як вечар прыйдзе, на пуховую пярыну спаць палажыць, цёплай коўдрай накрыць. Пеўню загадайце мяне не будзіць. Заўтра, як сонца ўзнімецца вышэй ваконца, я і сам устану.

І так з дня ў дзень, з года ў год.

Скора казка расказваецца, ды і жыццё не марудней мінае, толькі глянуць на яго не спачатку, а з канца. Калі яшчэ муж з жонкаю былі жаніх і нявеста, на вяселлі падарылі ім барану і плуг, зямліцу рабіць на пух, дзяжу і кляновую лапату, каб хлеб быў у хату. Ды вечнага ж нічога няма: пагубляліся ў бараны зубы, зрэзаўся ў плуга лямеш, лопнулі ў дзяжы абручы, расшчапілася лапата.

Састарэлі і муж з жонкаю.

Паклікаў тады бацька сына і кажа:

— Бяры каня і плуг, ідзі жыта сей, бульбу садзі. Што зімой есці будзеш, як адзін застанешся? Я ўжо і плуга не падыму.

Выправіўся Глеб араць, тут жа і вярнуўся. Кажа:

— Плуг не арэ, зямля як камень зрабілася.

Не паверыў бацька, просіць яго ў поле адвесці. А прыйшоў, глянуў: так і ёсць. Зямля нібы скала. Пад дажджом засохла — жалезам не ўспароць. Не па сабе стала дзеду, знак нядобры ўбачыў.

Загаласіла маці па сыне, як па нябожчыку, у бацькі слёзы пацяклі — жывому прападаць Глебу.

Гэта і ёсць сама бяда.

Кажа бацька сыну:

— Паміраць мы будзем. Холад за спінай стаў.

— Што ж,— адказвае Глеб,— прыйшла пара. Не мне ж вас гадаваць.

— А як жыць думаеш? — пытае бацька.

— Пражыву! Жанюся на царэўне...

— Іш, над сабою не ўладар, а ў марах — цар,— сумна ўсміхнуўся стары. — Не замахвайся на вялікую сасну, не ўмеючы ссячы малую лазіну. Ведаеш грушу дзікую каля лесу? Яна скарб трымае. Зможаш здабыць, дажывеш, як і мы, да старасці.

Сказаў так бацька, рукі зложыў і памёр. А праз колькі дзён і маці за ім пайшла.

Застаўся Глеб адзін. Выйдзе з хаткі, на лавачцы сядзе, пазногці на нагах разглядае і разважае: «Былі б лапці — да царэўны ў сваты паехаў бы». Толькі не было лапцей, а бацькавы стапталіся. І вырашыў Глеб спачатку скарб адкапаць.

У небе сонца ззяе, у полі людзі працуюць, у лесе птушкі спяваюць. І ў Глеба на душы радасна, нібы хто галоднага пятаком адарыў. Подбегам ідзе-спяшаецца: «Адкапаю скарб і заўтра ж у сваты падамся. Царавацць буду! Карэта ў мяне залатой будзе, рысоры крыштальныя, аглоблі алавяныя. У карэце замест сядзення — пярыны з кракадзілавага пуху, а навакол шуфлядачкі: у адной шакалад, у другой пернікі, у трэцяй... клёцкі...»

Падбег Глеб да грушыны і давай зямлю пад ёю калупаць. І там калупне, і на сажань далей, на тры ўправа, на сем улева... Адбяжыцца ў адзін бок, перакінецца ў другі. Ды хутка агледзеўся: рыдлёўка тупаватая, ручка сукаватая, зямля цвёрдая, а скура на далоні мяккая. І каб жа толькі трава! Тут і алешнік, і лаза, пераплялiся карані, хоць зубамі дзяры. «А-а,— думае Глеб,— заўтра прыйду. Скарб не воўк — паляжыць, у лес не збяжыць». І павярнуў ён дахаты. Засмучаны ідзе. Сустрэлася па дарозе дзяўчына, «Добры дзень» сказала, Глеб на яе і вачэй не ўзняў.

У казцы дзень — тыдзень, а то і год. З часам крыху ў марах змяніўся Глеб. Вось аднойчы ідзе да грушыны і думае: «Адкапаю скарб, з князёўнай ажанюся. Карэта ў мяне сярэбраная будзе, рысоры крыштальныя, аглоблі алавяныя. У карэце замест сядзення — пярыны з гусінага пуху. А навокал шуфлядачкі: у адной цукеркі, у другой пернікі, у трэцяй каравай хлеба».

А яшчэ праз пару дзён: «Толькі б скарб адкапаць — высватаю ў купца дачку: карэта ў мяне будзе пазалочаная, рысоры са шкла пад крышталь, драўляныя аглоблі волавам пацягну, замест сядзенняў — пярыны з сінтэтычнага пуху. А навокал шуфлядачкі: у адной бульба печаная, у другой бульба тоўчаная, у трэцяй — скарыначка хлеба».



Блізкі локаць, а не ўкусіш. Ходзіць Глеб каля грушыны, як кот каля гарачага сала.

...Кропля камень дзяўбе. Адным днём сонца не пякло, дзень пахмурны быў: толькі і працаваць цяжка. Глеб пад грушай дзірван рыдлёўкай надразае, рукамі разрывае, камяні ломам выварочвае. Прыпыніцца адпачыць, навокал гляне і забудзе, чаго ён тут. Адно бачыць: зямліца рыхлая, мяккая, як пух, стала. Дзе рос хмызняк — там хоць жыта сей. І кавалак ладны. «Вось каб бацькаву хату сюды перавезці,— думае Глеб,— адкапаю скарб, так і зраблю. А не адкапаю... упраўлюся і без яго. Сад развяду, бульбу пасаджу, жыта пасею. У двары завяду такі парадак, які ў бацькі быў». І ад такіх думак рукі Глебавы самі сабой да рыдлёўкі цягнуцца, работы патрабуюць.

Раптам крокі чыесьці пачуў, аглянуўся, а перад ім дзяўчына сялянская, якую неаднойчы па дарозе да грушы сустракаў.

— Пачастуй грушай, добры чалавек,— ветліва ўсміхаючыся, просіць дзяўчына.

Узрадаваўся Глеб, даўно голасу чалавечага не чуў. І тут жа засмуціўся: яму хоць душу палажы — хочацца пачаставаць дзяўчыну, але ж якія грушы?! А ўверх глянуў і абамлеў ад здзіўлення: ніколі такога ўраджаю на пладовым дрэве не бачыў. Ды якія грушы! Буйныя, сакавітыя, жоўтыя — ні ў казцы расказаць, ні пяром апісаць.

Вось дык скарб!

А дзяўчына думае: «Ну і хлопец! На гэтай грушыне спрадвеку не раслі грушы. Рукі ў яго залатыя. І прыгожы...»

І Глеб не можа вачэй ад дзяўчыны адвесці.

Добрая слава не доўга ў кошыку ляжыць! Дачуліся людзі пра дзіваграшу, і кожнаму хацелася на яе хоць разок глянуць. Кажуць, хто з той

грушы плод каштаваў, як нанава на свет нараджаўся. Бо чарадзейнымі грушамі і частаваў Глеб людзей ад усяго сэрца.

Потым людзі перадавалі, вяселле было: на ўсю акругу музыка грала. Знаць, нездарма яны сустрэліся, Глеб і дзяўчына тая. Глеб хату бацькаву на сваю зямлю перавёз. У яго садзе груша — лепшае дрэва. Казалі яшчэ людзі, праз які час каля грушы той бачылі і дзетак. Дваіх. На Глеба вельмі падобныя тварам. І працаўнікі такія ж: бацька за плугам ідзе, а яны ззаду бульбачку ў баразну садзяць...

А ўвечары сядзяць на лавачцы і слухаюць быль пра той скарб, які груша трымала.

## Таямніцы лясной палянкі

*Навагодняя казка*

Адкуль бяруцца навагоднія падарункі?

Па-рознаму кажуць. Некаторыя дзеці мяркуюць, што іх на фабрыцы пакуюць, а потым з крамы прыносяць мамы. А вось адзін заяц, што сустрэўся ў лесе, калі шукалі навагоднюю ёлку, расказаў так.

Сабраліся над лесам цёмныя-цёмныя хмары і пачалі снегам сыпаць. Дзень сыпалі, ноч сыпалі, а раніцай паплылі далей. Цяпер куды ні глянь, усё навокал бела-бела. І не разабраць з вышыні, дзе лес, дзе поле, дзе пень, а дзе калода.

На лясную паляну, адкуль ні вазьміся, сам Дзед Мароз — чырвоны нос — выйшаў. Рукавіцы ў яго сняжынкамі расшыты, футра мяцеліцай падперазана. І рукавіцы, і пояс — чарадзейныя. Хлопне Дзед Мароз тройчы ў рукавіцы — у зайцоў вушы мёрзнуць, распяража пояс-мяцеліцу — віхура закружыць, не бачна, дзе зямля, а дзе неба.

Стаіць Дзед Мароз на лясной паляне і на неба хмурыцца: Сонейка зноў праспала! Летам яно раненька прачнецца, праз лес перакульнецца і грэе, і ззяе, усё вакол асвятляе, кветкам пялёсткі распускае. А зімой неахвотна Сонейку ўставаць са сваёй цёплай вясёлкі-пасцелі і падымацца ў халоднае неба.

Ледзь Сонейка паказалася над лесам, Дзед Мароз павесялеў, чарадзейныя рукавіцы здзеў: цяпер і зверанят склікаць пара.

Тут сарокі залёталі, застракаталі, усім зверанятам наказ перадалі. Дзед Мароз і вокам міргнуць не паспеў, як лясны народ на выклік прыспеў. Толькі Мядзведзя не было. Ён у бярлогу спаў, лапу смактаў. Лапа ж салодкая: ён восенню яе ў мёд апусціў.

А Дзеду Марозу і зверанятам клопат — вось-вось Новы год настане, дзеці падарункі чакаць стануць, а іх яшчэ падрыхтаваць трэба, самі ж яны не зваляцца з неба. І вось зверанята сход адкрылі, як падарункі сабраць, гаварылі. І толькі Лісіца — рыжая хітрыца хвастом круціць: маўляў, нічога ў яе няма (не хоча клапот задарма).

Прагналі Лісіцу. Астатнія зверанята: і ваверчанята, і зайчанята, і нават Воўк — зубамі шчоўк, усе-ўсе за работу ўзяліся.

А Дзед Мароз паклікаў свой лёд-самалёт, каб адправіцца ў далёкі палёт. Снягурачку з сабой забраў, у іх таксама многа спраў.

На паляне ж работа кіпіць. Снегіры з лясных яблынь яблыкі зрываюць, а ваўкі іх у мяшок — і скок-скок на паляну. Так расла яблыкавая гара. Забыліся вавёркі на свае вячоркі, над сарокамі не насміхаюцца, а таксама завіхаюцца — арэхі з лясных кладовак дастаюць. Так расла арэхавая гара.



А сарокі, ох, гэтыя белабокі! Без іх не абысціся. Яны за трыдзевяць зямель злятaлі і рассакаталі, што трэба апельсіны. Там звяры добрыя, на дружбу шчодрыя, і з самага поўдня адправілі лебедзяў-гусей з апельсінамі для нашых дзяцей. Так расла апельсінавая гара.

Лісіца ж, на зло майстрыца, тым часам задумала адпомсціць Дзеду Марозу і зверанятам за тое, што хітрыкі яе разгадалі і з лясной паляны прагналі. Адшукала яна ў лясным гушчары дуб, у дубе — дупло. Вялікае-вялікае, цёмнае-цёмнае, зверху лёдам закаванае. Лісіца дубінкай раз стукнула, два — лёд разбіла, Адлізе і Капяжу выхад з дупла адкрыла. А яны ж — вядома кожнаму — ворагі Дзеда Мароза.

— Ну, трымайся, Дзед Мароз! — крыкнула Адліга.— Мы пагрэем табе нос.

— Кап-кап-кап,— пацвердзіў Капеж.— Ты ад нас не ўцячэш.

Прыляцеў тут іх конь-Вецер, падхапіў брата з сястрой і панёс над зямлёй даганяць лёд-самалёт з Дзедам Марозам і Снягурачкай.

А Дзед Мароз пабываў ужо ў Шакаладным горадзе, набраў у лёд-самалёт шакаладу. У Цукерачным горадзе набраў цукерак і накіраваў свой чарадзейны самалёт да лясной паляны.

Ляцелі-ляцелі, па адным перніку з'елі. Ляцелі-ляцелі, па другім перніку з'елі. Ляцець жа яшчэ доўга, а Новы год хутка. Ну, ды нічога, думаюць, паспеем.

Раптам, адкуль ні вазьміся, наляцелі на лёд-самалёт цёмныя-цёмныя хмары, наўкола свіст узняўся, грукат... Глянуў Дзед Мароз у ілюмінатар і жахнуўся:

— Бяда, Снягурачка,— кажа,— хтосьці Адлігу з Капяжом выпусціў. Падай мне хутчэй рукавіцы, яны дапамогуць ад бяды адбіцца!

Падае Снягурачка Дзеду Марозу рукавіцы, сняжынкамі расшытыя, а тут падскочыў конь-Вецер, выхапіў іх і на зямлю скінуў. Адліга

і Капеж смялейшыя цяпер: няма ў Дзеда Мароза чарадзейных рукавіц, чаго ж баяцца. І трашчыць лёд-самалёт, усё тае, тае, толькі кроплі з яго слязінкамі-дажджынкамі сцякаюць.

У роспачы Снягурачка: не дачакаюцца дзеці навагодніх падарункаў. А Дзед Мароз не здаецца, ведае, быць такога не можа! Распеpазаў ён пояс-мяцеліцу, і пайшла яна гуляць, снег віхурай узнімаць. Адлігу з Капяжом ад самалёта адганяе, да зямліцы прыціскае, ды не можа без чарадзейных рукавіц адолець.

А ў гэты час звераняты — працавітыя рабяты на лясной паляне Дзеда Мароза са Снягурачкай чакаюць, пра бяду нічога не знаюць. І яблыкі, і арэхі, і апельсіны яны сабралі. Ды потым трывожыцца сталі: чаго гэта мяцеліца разгулялася? Дзед Мароз злуецца, значыць, штосьці з ім здарылася, няйначай! І чаму гэта Лісіцы, хітрай хітрыцы няма? Ану, сюды яе! Падышлі звераняты да лісінай хаткі: выходзь з нары! Гавары, што знаеш, чаго нас пазбягаеш? Зноў штосьці натварыла?

Не вытрымала Лісіца, вочы апусціла. Прызналася. Ды і як не прызнацца: хто зло ўтойвае, у таго на лбе напісана.







Паімчаліся тут усе звяры і птушкі туды, дзе Дзед Мароз са Снягурачкай з Адлігай і Капяжом змагаліся, дзе конь-Вецер завываў, а мяцеліца іх да зямлі прыціскала, лёдсамалёт ад гібелі абараняла. Прыбеглі звераняты, рукавіцы чарадзейныя на зямлі адшукалі, птушкам іх падалі, а тыя падхапілі і Дзеду Марозу ўвысь панеслі.

Цяжкія, ох, цяжкія чарадзейныя рукавіцы, а Вецер усё мацней насядае, за крылы хапае... Ён добра ведае, што яму канец, калі іх Дзед Мароз надзене. Цяжка птушкам, сіл болей няма, але ўжо бачаць яны Дзеда Мароза, ён так іх чакае не дачакаецца. Снягурачку бачаць, яна хоча дапамагчы птушкам і не можа. А лёдсамалёт танюсенькі стаў, зусім празрысты — вось-вось разваліцца, шакаладкі, цукеркі і пернікі пагубляюцца. Таму Снягурачка і плача: які ж Новы год без падарункаў? Не было ўжо сіл у птушак, і яны выпусцілі б рукавіцы, але ж як пакінуць у бядзе самых жаданых зімою гасцей. І данеслі. Дзеду Марозу падалі. Ён надзеў іх хутчэй, ударыў у далоні, ды так, што конь-Вецер адразу сілу сваю згубіў, а Капеж і Адліга тут жа ледзяшамі сталі.

Прыляцелі Дзед Мароз са Снягурачкай на паляну і хутчэй за справу бяруцца. Перш-наперш зайцам быў такі наказ: на ўскрайку лесу людзей сустракаць і паказваць ім, дзе ялінкі чарадзейныя,

святочныя,— толькі пад такімі знойдзецца падарунак у навагоднюю ноч.

Разбегліся зайцы па лесе і ўсё рабілі, як было сказана.

А на паляне звераняты ласункі па пакетах раскладваюць, птушкі завязваюць на іх стужкі. Хутка, хутка Новы год!

Дзед Мароз тройчы ў рукавіцы хлопнуў, нагой прытупнуў — снег пайшоў. Ляцяць пушыстыя сняжынкі, якая з іх над палянай перакуль-нецца, тут жа Дзедам Марозам абернецца. Стала іх многа-многа, Дзедаў Марозаў. Бо гарадоў у нас многа, а вёсак і не злічыць. І кладуць яны падарункі ў свае распісныя мяшкі і ідуць, хто ў школу, хто ў дзіцячы садок, а хто і да цябе прыйдзе, падарунак прынясе.

А што з Лісіцай? Як яе пакаралі? Усе цяпер ведаюць, што Лісіца — злосная хітрыца. Усе яе пазбягаюць, усе з ёй не размаўляюць. Няма ў яе сяброў. А ці ж гэта не пакаранне?!

Тс-с! Здаецца, хтосьці ідзе. Напэўна, Дзед Мароз падарункі прынёс.

З Новым годам!

## Змест

Янкава крынічка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3
Пра вучонага сына і мудрага бацьку . . . . . . . . . . . 12
Як Гаўрылка пана са свету зжыў . . . . . . . . . . . . . . 15
Фількава грамата. *Памяці Уладзіміра Караткевіча* . . . . . . . . . . 21
Зачараваная гаспадарка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 35
Замова на замову . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 50
Самабраны абрус . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 54
Казка-быль, як будаваў хатку Базыль . . . . . . . . . . 59
Яська-касец. *Казка-жарт* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 66
Адкуль вёска Пустапарожняя. *Казка-жарт* . . . . . . . . 69
Пра дровы. *Прыпавесць* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 72
Чарадзейная груша . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 75
Таямніцы лясной палянкі. *Навагодняя казка* . . . . . . . 80

**Сіняўскі, П.**

С38 Зачараваная гаспадарка : казкі гаспадара Пятра з-пад Полацка : для дзяцей малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту / Пятро Сіняўскі ; мастак Марыя Каратаева. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2022. — 86 с. : іл.

ISBN 978-985-02-2111-7.

Казкі, сабраныя ў гэтай кнізе, уражваюць трапнай самабытнай мовай, а казачныя падзеі адмыслова знітаваныя з сучаснасцю. Прыгоды, дзівосы, вандроўкі ў пошуках шчасця і сэнсу жыцця — казкі Пятра Сіняўскага будуць цікавыя і дзецям, і дарослым.

**УДК 821.161.3-93**
**ББК 84(4Беи)-44**

Літаратурна-мастацкае выданне

**СІНЯЎСКІ** Пятро (Пётр Іванавіч)

ЗАЧАРАВАНАЯ ГАСПАДАРКА

*Казкі гаспадара Пятра з-пад Полацка*

Рэдактар *А. В. Спрынчан*
Мастацкі рэдактар *В. І. Сенчанка*
Тэхнічны рэдактар *Т. В. Свірыдзенка*
Стылістычныя рэдактары *М. С. Неўгень, В. В. Крывадубская*

6+

Падпісана да друку 11.11.2022. Фармат $84 \times 90^{1}/_{16}$. Папера афсетная.
Гарнітура Times New Roman. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 7,7.
Ул.-выд. арк. 5,82. Тыраж 1000 экз. Заказ 474.

Выдавецкае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Мастацкая літаратура» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/5 ад 09.07.2013.
Пр. Пераможцаў, 11, 220004, Мінск.
www.mastlit.by; e-mail: mail@mastlit.by

Адкрытае акцыянернае таварыства «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/3 ад 10.09.2018.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, Мінск.




ISBN 978-985-02-2111-7

Пятро Сіняўскі

# Зачараваная гаспадарка